Астроўка і Трасцянка ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Успаміны з Зубава ☞ 9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 51 (2849) Год LV | Беласток, 19 снежня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

КНЯЗЬ З БАНДАРОЎ

— Гэта так выдатна акрэслівае спадара прафесара, яго годнасць і дастойнасць, што варта запомніць гэтае названне, — падводзіць вечарыну прафесар Тэрэса Занеўская, з ляўдацыі якой пачаўся юбілей 80-годдзя Алеся Барскага, паэта, дзеяча, прафесара.

Беластоцкія „Сподкі” прывыклі ўжо прымаць беларускія мерапрыемствы ды іх герояў. „Князь з Бандароў”, які апошнім часам вельмі рэдка наведвае роднае Падляшша, на гэты раз, нягледзячы на клопаты са здароўем, прыехаў сустрэцца з рознымі пакаленнямі сваіх вучняў, студэнтаў, чытачоў ды сяброў.

— Дзядзька тэлефануе нам рэгулярна, прасіў быць і сёння з ім, — гаворыць Тамара Драбікоўская-Хмара, якая разам з дачкой прыйшла па-сямейнаму ацяпліць атмасферу мерапрыемства. — Гэта для нас важнае, што можам быць часткай беластоцкага юбілею.

Беласток зараз не часта вітае паэта Алеся Барскага ці прафесара Аляксандра Баршчэўскага. Пасля доўгага часу, афіцыйна і з пашанай, па грамадскай ініцыятыве Валянціны Швед, прыняў ураджэнца Бандароў у першую чаргу як сябру і чалавека вялікіх заслуг для беларушчыны ды польска-беларускага дыялогу.

— Для нас прафесар Баршчэўскі здаваўся заўсёды строгім, недаступным, усе як адзін яго баяліся, — успамінаюць наймалодшыя, лаўрэаты алімпіяды па беларускай мове. — Сёння аказалася, што гэта звычайны чалавек, які натуральна, часам дасціпна распавядае пра сваё жыццё. Стаўся намнога бліжэйшы нам. Напэўна будзем зараз пра яго цёпла думаць.

Прафесар Баршчэўскі пытанне беларускай алімпіяды давёў да пазітыўнага вырашэння і ўжо шаснаццаць гадоў з'яўляецца суддзёю ў справе будучыні многіх ліцэістаў. Гэта далёка не адзіная заслуга ў яго беларускай і настаўніцкай працы. Факт, што да гэтай алімпіяды гатовяць зараз вучняў былыя студэнты прафесара, гэта лепшы доказ яго мэтанакіраванай дзейнасці. Па-майстэрску, можна сказаць, правёў таксама свой юбілей, бо якраз выступленне самога юбіляра стала важнейшым атракцыёнам сустрэчы. Называў таксама і іншых герояў са свайго жыцця. Усім запомнацца выдатны гаспадар, арганізатар бясед Сяргей Раманчук, муж ідэальнай жонкі Міхась Хмялеўскі, мастак — Робін Худ — Мікола Карпенюк ці завочны студэнт Сцяпан Бурыла. Не кожнаму прыйшлося раней пазнаць звычайны твар вялікага паэта, які па-чалавечаму ацэньвае сустрэтых на сваёй дарозе людзей, які цешыцца са спаткання з доўга нябачанымі сябрамі, які... у снежні прыносіць травень... Паэтычнага боку гэтага юбілею немагчыма абмінуць, хаця, гледзячы на жыццё прафесара, да канца невядома, якое месца па ступені важнасці займае паэзія. Затое вядома, як уплывала на чытачоў.

— Я пачаў чытаць вершы Алеся Барскага, калі мне было семнаццаць гадоў, асабліва тыя пра каханне, бо якраз паэт пісаў пра гэтае пачуццё без непатрэбнай мартыралогіі, — кажа Яўген Вапа, суарганізатар сустрэчы з боку тыднёвіка „Ніва”, паклоннік паэзіі юбіляра. — Шчыра кажучы, я ўвёў бы якраз тыя вершы ў праграму навучання беларускай мовы, каб нашая моладзь пазнавала высакародную паэзію не толькі ў патрыятычным варыянце.

На сцэну ўваходзілі па чарзе прадстаўнікі ўдад, дэлегацыя ад Пасольства Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі белліцэяў, дзеячы, чытачы, людзі, якія інспіраваліся творчасцю Барскага і перакладалі яе на словы свайго мастацтва, так як Марк Яраш ці Марыюш Пятровіч. Больш за дзесяць гадоў таму выступалі яны з песнямі на словы Алеся Барскага, а цяпер прыйшлося ім вярнуцца да гэтых выканаанняў і ўспамінаў. Аказваецца, што постаць паэта і прафесара можа таксама даваць інспірацыю пісаць сваё. „Як проста павярнуць час”, — пачынае чытаць твор, пры-

працяг ☞ 8

Страх

Іх было трое. У нас такая даўняя традыцыя — на траіх. Так лепш, бо двое заўсёды пасварацца. У нас, беларусаў, гэта яшчэ адна наша традыцыя сварыцца, калі мы ўдвох. А ўтрох таксама пасварацца, але там ёсць адна акалічнасць. Там, калі ўтрох, заўсёды будзе адзін, які прымірае, каб не дайшло да бойкі.

Дык вось яны так і стаялі ўтрох, і гучна размаўлялі каля гарэлачнага аддзела адной з гродзенскіх крамаў. Чарга была невялікая. Але трое мужчын, ужо добра пад шафэ (відаць за каўнер залілі не адну чарку зранку і без закускі, прынамсі без добрай закускі), захопленыя размовай, ветліва (наколькі ветліва ім дазваляў іх стан) прапускалі людзей па-за сваёй калейкай.

— Праходзьце, праходзьце, — казалі яны іншым, нязграбнымі рухамі паказваючы тым, хто заняў чаргу за імі, куды трэба праходзіць. У іх паводзінах, рухах, жаданнях адчувалася нейкая звышпаказная дабрыня, чалавечнасць, ветлівасць... Такім добрым бывае толькі сапраўды добры, наш, беларускі чалавек, які ўжыў адпаведную дозу алкаголю і зараз, пад уздзеяннем той алкагольнай дозы, знаходзіцца ў стадыі паміж цвярозым бесчалавечным занудствам і перапітай шалёнай бесчалавечнай агрэсіяй. Гэты сярэдні стан вызначаецца сапраўды шчырым жаданнем дагадзіць хоць чым-небудзь абсалютна незнаёмым людзям, пастарацца выглядаць сапраўдным джэнтльменам, і, як гэта не парадаксальна, адчуваць сябе цалкам цвярозым.

Праўда, ёсць адна акалічнасць! Нават у такім звышдобразычлівым і чалавекалюбівым стане наш, беларускі чалавек заўсёды захоўвае асноўныя інстынкты агрэсіі ў дачыненні да суразмоўцы і ўвогуле да людзей блізкіх, незалежна ад таго ці гэта яго сябры, ці радня, ці нават сям'я. Таму, паміж сабой, ветлівыя да астатняга мірнага насельніцтва Гродна мужчыны размаўлялі на падвышаных нотках, з агрэсіўна-нецярпімымі бляскамі ў добра залітых вачах.

— Да мяне ўчора апазіцыянер звяртаўся. Сусед мой. Казаў, каб я ў незалежнае назіранне пайшоў. І яшчэ людзей шукае. Можа хто з вас хоча? — насмешліва спытаўся ён, злёгку хістаючыся.

— А нашто мне гэта трэба? — загаласіў адзін з яго сяброў. — Усё адно зробяць так, як захочуць. Ад нас нічога не залежыць. Толькі праблем сабе нажывеш.

Яго сябра такі адказ не задаволіў.

— Дык ты баішся? — падсмяяўся той.

— Я? Ды я нічога не баюся. Проста не бачу ў гэтым сэнсу.

— І ты не бачыш? — спытаўся хлопец у трэцяга суразмоўцы.

— А мне навошта гэты клопат? — адказаў той. — У мяне жонка цяжарная. Гэта Стась хай ідзе, — і ён кіўнуў на другога суразмоўцу. — Хай ён змагаецца. У яго нават сям'і няма. Таму яму няма чаго баяцца. Ні жонкі, ні дзяцей! Чым ён рызыкуе? Хай пакажа сваю смеласць. А ў мяне, я казаў ужо, жонка цяжарная. Зараз яшчэ нейкія праблемы мне на рабоце за тое ўчыняць. Чым я тады сваё дзіцё карміць буду?

— Ты мне тут не заварочвай мазгоў, — не пагадзіўся з такімі высновамі нежанаты і бяздзетны калега. — Якога чорта я сваю галаву падстаўляць буду. Дзеля чаго? У мяне ні сям'і, ні дзяцей. За што мне змагацца? Гэта хай Косця змагаецца. У яго жонка цяжарная. Дзіцё хутка будзе. За сваё дзіцё хай і б'ецца. А ў мяне няма дзяцей. Мне няма за каго змагацца. Мне і так добра. Вып'ю „крыжачка", пасплю. А там, глядзіш, і Светка зойдзе. Што мне яшчэ трэба?!

— Ды каб у мяне не было сям'і, я б не сядзеў і не хаваўся. Я б пайшоў на ўсё. Я такое ім зрабіў бы, што яны і блізка забыліся б, як выбары падрабляць! Але мне нельга цяпер. Жонка цяжарная. Я не магу работы згубіць. Мне дзяцей карміць трэба.

— А ў мяне, каб былі дзеці, то я за іх на ўсё пайшоў бы. Не сядзеў бы, як ты, і не думаў бы, што цяжарную жонку нельга нерваваць. Народзіцца дзіця, а ты для яго што зрабіў?

Спрэчка ў хлопцаў дайшла да крытычнай мяжы, бо ў такім стане, як у іх, лёгка даходзіць да бойкі. І дайшло б. Але ўмяшалася адна сталая жанчына з чаргі:

— Эх вы, мужыкі, — прастагнала яна. — Чаго толькі не прыдумаеце, каб апраўдаць сваю баязлівасць. Ёсць сям'я — нельга змагацца, няма сям'і — няма за што змагацца. Ды прызнайцеся сабе, што вы проста не мужыкі.

А мне было шкада толькі таго, што назіральнікам ад АБСЕ не аплачваюць чэкаў за гарэлку. Таму іх тут і не было. І не маглі яны пачуць той размовы, і зразумець галоўнай рэчы — нельга прызнаваць выбараў справядлівымі там, дзе людзі баяцца.

Віктар САЗОНАЎ

Зіма не адпускае

У гэтым годзе зіма не прыйшла знянацку, але так, як тыдзень раней прадказвалі метэаролагі, на зломе лістапада і снежня. На Падляшшы і па ўсёй Польшчы скончылася гэта многімі транспартнымі праблемамі, шматлікімі невялікімі аварыямі і вялікім раздражненнем вадзіцеляў і пешаходаў. Дастаткова, каб снег пасыпаў некалькі гадзін і пры невялікім марозе, але з моцным ветрам дайшло да паралічу на дарогах перад вялікімі гарадамі і ў іх саміх. Быў дзень, калі перад Беластокам паліцэйскія спынялі аўтафуры, у час, калі на дарогах быў самы вялікі рух, бо тыя, затрымаўшыся ў горадзе перад невялікімі ўзгоркамі, а нават перад невялікімі бугаркамі на дарогах, пасля без дапамогі не маглі зварухнуцца з месца і тармазілі рух. Прапускалі іх пазней у вялікіх калонах з эскортам паліцэйскіх машын. Але і без аўтафураў хапала праблем з перамяшчаннем на аўтамабілях па недастаткова расчышчаных вуліцах. Рух на вуліцах Беластока часта тармазілі таксама легкавушкі, якіх вадзіцелі не паспелі памяняць шын з летніх на зімовыя. Такія аўтамабілі коўзаліся, калі, затрымаўшыся перад святлафорамі, трэба было зварухнуцца з месца, а пад коламі ляжаў убіты снег, які пасля пераўтвараўся ў лёд. Падобныя з'явы можна было таксама ўбачыць у Гайнаўцы, Бельску-Падляшскім і на ваяводскіх і іншага рангу дарогах побач гэтых гарадоў.

— Калі едучы па Бельску хацеў я павярнуць направа і крыху прытармазіў, заўважыў, што машына сунецца па выкаўзаным снезе. Рашыўся паехаць далей і павярнуць у чарговую вуліцу, бо апасаўся, што выконваючы паварот з большай хуткасцю на выкаўзанай паверхні магу папасці ў аварыю. Выязджаючы пазней з Бельска побач гэтага самага месца заўважыў я машыну, што ляжала ў рове. Праўдападобна на гэтым самым павароце вадзіцель страціў кантроль над аўтамабілем і, абкрунуўшыся, уехаў у роў са снегам. Добра, што ў гэтым часе ніхто не ехаў насупраць, бо тады магла б здарыцца сур'ёзная аварыя і машыны былі б намнога больш разбітымі, — расказваў жыхар Гайнаўскага павета, які ў неспрыяльных зімовых умовах паехаў у Бельск. — На дарозе з Бельска ў Гайнаўку месцамі здувала снег, а месцамі ляжыць ён моцна выкаўзаны і на гэтых адрэзках трэба ехаць больш уважліва, каб у час нечаканага здарэння магчы спыніць аўтамабіль.

У найгоршыя дні лістападаўскай зімы беластачане найбольш наракалі, на гарадскі транспарт, які застрагаў сярод патоку аўтамабіляў і бывала, што аўтобусы перамяшчаліся праз гадзіну толькі на адзін, два або тры кіламетры, а ўсхваляваныя пасажыры рашаліся ісці пяшком, бо цяжка было нават заказаць таксі. Здараліся таксама выпадкі, што з аўтобусаў трэба было выходзіць непасрэдна ў снег і страгнуць па калені. Калі гэта прыходзілася рабіць старэйшым асобам або асобам у нізенькім абутку, даходзіла яшчэ чарговая раздражненасць. Снег на аўтобусных прыпынках і тратуарах быў таксама спачатку ў Гайнаўцы і Бельску, а на некаторых тратуарах застаўся ляжаць даўжэй.

Калі перастаў сыпаць снег, прыйшоў вялікі мароз, які ў адзін з першых дзён белай восені на Беласточчыне дасягнуў нават узроўню 26 градусаў са знакам мінус, а пры зямлі нават да 33 градусаў. Добра, што днём цяплела да 12-13 градусаў са знакам мінус і тады ўлады Беластока і Управа краёвых дарог рашаліся сыпаць на паверхні дарог такую соль, што раз'ядала снег і тады беластоцкія і краёвыя дарогі, напрыклад тая ў Бельск і Сямятычы, станавіліся чыстымі. Аднак такога стандарту ўтрымання дарожных паверхняў няма на нашых ваяводскіх дарогах, а таксама ў Бельску і Гайнаўцы, не гаворачы ўжо пра меншыя нашы мясцовасці. На жаль, у Гайнаўку не даходзіць ніводная краёвая дарога і яна з'яўляецца хіба адзіным павятовым горадам у нашай краіне без акуратна расчышчанай даязной дарогі. На ваяводскіх дарогах, што даходзяць у Гайнаўку з Беластока, Бельска і Кляшчэляў, расчышчаецца дарожная паверхня толькі з сыпкага снегу, а ўбіты астаецца. Такі выкаўзаны снег ляжаў у канцы лістапада і на пачатку снежня. Расчыстка ваяводскай дарогі з Гайнаўкі ў Белавежу яшчэ горшая, чым згаданыя мною дарогі. Праходзіць яна праз Белавежскую пушчу, а ў многіх месцах праз ландшафтны запаведнік і службы адказныя за яе расчыстку стараюцца максімальна пазбягаць сыпання там нават натуральнай солі, якую падсыпваюць на ваяводскія дарогі ў час невялікага марозу на ўзгорках і скрыжаваннях. Гэта таксама ёсць кошт аховы Белавежскай пушчы.

Аляксей МАРОЗ

Чаромха

Не дзяліць, а яднаць...

6 снежня адбылася II сесія Рады гміны ў Чаромсе. Пасяджэнне адкрыла старшыня Рады Надзея Суліма. Зачытала яна прапанаваны парадак дня, які прадугледжваў, між іншым, прысягу войта-электа, вызначэнне зарплаты войту, старшыні і намесніку старшыні Рады гміны ды стаўкі камандзіровачых радным за ўдзел у нарадах.

У пасяджэнні ўдзельнічалі старшыня Рады павета Мікалай Міхалюк і радны Мікалай Васілюк, каменданты Пагранічнай аховы і Паліцыі, солтысы, кіраўнікі гмінных устаноў і шматлікае кола жыхароў пасёлка. Пасля цырымоніі прысягі настаўніца-пенсіянерка Яніна Скок з групкай жыхароў павіншавалі Ежы Шыкулу з выбарам на пасаду войта. Прысутныя ўзнагародзілі гэта бурнымі апладысментамі. Затым голас узяў войт.

— Ад заўтрашняга дня пачынаю працу. Лічу на станоўчую падтрымку новаабранай Рады. У адпаведнасці з прысягай абавязкі буду выконваць дабрасумленна і паводле закону, у карысць чаромхаўскай грамадскасці, якая абдарыла мяне даверам. І гэты давер апраўдаю. Так мне дапамажы, Божа!

Калі пад галасаванне ставіўся парадак дня, радная Валянціна Кердалевіч прапанавала адтэрмінаваць пункт „прыняцце прапаноў" аргументуючы, што гэтыя спярша павінны быць абмеркаваны бюджэтнай камісіяй. Прапанову падтрымаў радны Раман Туркевіч. У выніку галасавання прапанова была прынята аднадумна.

У сравах „бягучыя пытанні" Валянціна Кердалевіч запытала, хто арганізаваў сесію і запрашаў гасцей і чаму няма былога войта Міхала Врублеўскага.

— Усё ж такі працаваў ён у Чаромсе дваццаць два гады, — аргументавала радная, — і належыцца яму падзяка. Такой звычкай карысталіся раней у гміне?

У адказ Надзея Суліма сказала:

— Калі гэта мае быць пачаткам скандалу, дык віншую...

Спрэчку паспрабаваў суцішыць радны Смык:

— Вельмі прыкрая справа, — заявіў, — але нельга раўняць старых звычак. Як сказаў прэзідэнт Камароўскі, трэба яднаць людзей, а не дзяліць. Павіншуйма затым Мікалая Міхалюка з выбарам на старшыню Рады павета, — з усмешкай гаварыў далей прамоўца. — Добрай навінкай няхай будзе і гэта, што Чаромха мае ў павеце другога раднага, Мікалая Васілюка. Павіншуйма затым іх...

У далейшай дыскусіі солтыс Зубачоў Дзмітры Асепскі крануў справу расчысткі заснежаных дарог.

— Нельга праехаць са Ставішчаў у Полаўцы, як і з Зубачоў у Баброўку. Хто за гэта адказны?

Іншай думкі была солтыс з Пагулянкі, якая заявіла, што да іх дарога расчышчана і дзякуе за гэта гміне. Ніжэйпадпісаны абвінавацій лясніцтва ў тым, што праз Кузаву вызначыла маршрут для вывазкі хлыстоў. Вясковы асфальт не вытрымае вялікага грузу і неўзабаве рассыплецца. А на гэта нельга дазволіць.

У адказ на пытанні войт заявіў:

— Неадкладна вызначым стратэгію чарговасці расчысткі заснежаных дарог. Не можа тут быць лепшых і горшых. У справе вывазкі лесу праз Кузаву выступім з адпаведным пісьмом у староства з патрабаваннем абмежаваць рух перагружанага аўтатранспарту. Як паведаміў старшыня Рады павета М. Міхалюк, на тэрыторыі Чаромхаўскай гміны прадугледжваюцца такія павятовыя інвестыцыі як мадэрнізацыя вуліцы Ставіскай і Фабрычнай, ды пабудова дарогі ў Апаку-Вялікую.

На гэтым афіцыйная частка пасяджэння закончылася. Затым прысутныя разам з войтам наведалі Гмінную ўправу і пазнаёміліся з працаўнікамі.

Уладзімір СІДАРУК

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Астроўка і Трасцянка

Гэты дзень у Трасцянцы, 26 чэрвеня 2009 года, адхварэлі прынамсі трое жыхароў гэтай вёскі: Галя Тапалянская, Віця Стахвюк і Міхал Астроўка. Войт сказаў трасцянскаму насельніцтву: „Я ведаю, чаго вы хочаце. Вам не трэба мяняць назвы вёскі. Усё выдумалі гэтыя Вапы і Латышонкі з вядомых арганізацый". Уся вёска і прысёлкі да ўпачення білі яму ў ладкі.

Еду ў снежаньскую нядзелю 2010 г. зноўку туды, а яшчэ на ўспамін таго сходу хвалююся. Першы позірк направа, на першую хатку, засыпаную снегам. Аж вочы працірaю, брыдучы праз гурбы снегу: на мураваных шэрых сценах чорны надпіс „SPRZEDAM". Дзе дзядзька Міхал, дзе цётка Ніна? Цётка Ніна памерла, кажа суседка, сяброўка іхняга сына, а Міхал у сына, у таго, што краму трымае, каля царквы. А ў той краме скажуць, што дзядзька Міхал моцна воры, у Беластоку ў бальніцы. Невядома, ці дагаворышся, хоць дзеду вельмі хочацца гаварыць.

... Міхал Астроўка ехаў тады праз палову вёскі на сваім вазку, па непаладжаным яшчэ перад чарговымі выбарамі тратуары. Набліжаўся да крамы... А тут піўная кампанія абмяркоўвала ход сходу.

— Так, *доводы* перамяняці, і тое што бацько перапісаў, усе дакументы, то што нам рабіці? Хто за гэта верне? — хвалюецца адзін бяседнік з лавачкі каля століка пад крамай.

— За змены ўнесеныя ў дакументы ж будзе плаціць дзяржава, міністэрства, — прабую перабіць гамонку, калі кожны хоча гаварыць у адзін час і пераканаўча.

— У гміне інакш казалі. Наша радная казала, каб не згаджацца на змену, бо ў гміне будуць мець таксама клопат.

— Пытаюся ў кіроўцы, як ты будзеш, Зыгмунт, выдаваць білеты: замест *Тшэсьцянка — Трэсцянка*. А ён мне на тое: „Што ты п...іш? Хто то выдумаў такое дурное?"

— Гэта ж польскія чыноўкі выдумалі, ды і не так даўно.

— То ж з нас смяяцца будуць, што мы з якоесь „Трэстянкі".

— То ж калісь было, і ніхто не смеў смяяцца з трасцяніцкіх людзей.

— Як яны маюць, к...а, грошы, то хай на што іншае нам дадуць.

— То ж пашпартоў не будуць мяняць.

— Мне не будуць мяняць, але маім каровам трэба будзе. Яны ў Еўрасаюзе, і пашпарты таксама маюць. О, забач, хто на калясцы едзе! Толькі адазвіся на сходзе, дзед, то пабачыш, што табе будзе! — крычыць гаспадар, якога турбуе добрае імя кароў, на трасцянікага старажыла, які ўжо дакаціў сваю каляску пад сынаву краму.

— Толькі скажы, што хочаш памяняць, дастанеш! Адазвіся толькі!

— Я хачу вярнуць праўду... — досыць моцна азываецца дзядуля, ды наведвальнікі крамы падымаюць шум.

— Ты, Астроўка, заўша толькі сееш замэнт! — прабіваецца з гвалту голас тры разы ад яго маладзейшага трасцянца з бутэлькай піва. — Я за сваё п'ю!

А ў 1994 годзе Міхал Астроўка быў за тое, каб Трасцянку з Нарваўскай гміны далучыць да Заблудаўскай гміны, не па якойся цязе да Заблудава, а па жаданні належаць да беластоцкай службы аховы здароўя ў Беластоку. Але страцілі б тады свой асяродак здароўя, бо ЗОЗ у Заблудаве ліквідаваў тады асяродак здароўя ў Фальварках-Тыльвіцкіх, вёсцы такой як Трасцянка. Астаткам сілы скаланулася ўжо тады амаль пенсіянерская вёска, і моцна пасварылася. На сходзе запалохалі сэцэсіяністаў, што частка з іх адразу адмовілася ад уласных подпісаў. Сход той быў у школе (цяпер і школы няма — там дом сацыяльнай апекі, там і лекар). Вось гэтая Трасцянка, заснаваная праўдападобна пад канец XV стагоддзя пад назвай Тростяніца. Раней тут узнік Двор Тростянскі пры шляху з Літвы ў Карону. Тая дарога, працінаючая вёску, гэта ваяводская дарога нумар 685, фрагмент галоўнага камунікацыйнага шляху паміж сталіцай ваяводства Беластокам і павятовым местам Гайнаўкай — ад абодвух гарадоў Трасцянка ў 30 кіламетрах адлегласці. Трасцянку некалькі раз гісторыя амаль змятала з паверхі зямлі — у час шведскага патопу, у першую сусветную вайну, калі амаль усё насельніцтва пасля 1915 года было эвакуавана ў глыб

Расіі, не пашкадавала вёскі і апошняя вайна. Славілася яна ў XIX стагоддзі адукаванасцю і свядомасцю сялян. Была ў ёй царкоўна-парафіяльная школа з настаўніцкім курсам для жанчын і мужчын, арганізаваліся тут курсы рамёстваў — залочання, мулярства, разьбы і ткацтва, бібліятэка, якой карысталіся сяляне. Умелі яны змагацца за сваё. Гэтая адна з самых вялікіх вёсак на Беласточчыне славілася бойкасцю сваіх хлопцаў. Калі ў 1926 годзе Грамада арганізавала свой з'езд, які меўся адбыцца ў Трасцянцы, было вырашана правесці яго ў Старабераэове — арганізатары пабаяліся, што трасцяне не здадуцца паліцыі і паліецца кроў. А ў Міхала Астроўкі такі ж тэмперамент быў заўсёды, *усё сеяў замэнт*, бо чагосьці патрабаваў, крытыкаваў, пільнаваў, абмяркоўваў, пісаў, што не кожнаму было ў смак. Уладам перш за ўсё. А цяпер ідзе па вёсцы, нямоглы, бо адмовілі яму ногі, каб прагаласаваць за вяртанне старой назвы вёсцы — Трасцянкі, якую ўлады няўмела „пераклалі" на „Тшасцянку" ўжо ў другой палове дваццатага стагоддзя. А баявітыя трасцяніцкія хлопцы гатовы можа не даць дзеду ў глухаватае вуха, як пастрашыць, каб той сціх. Ехаў сюды пад краму ад таго доміка, на якім праз крыху больш года красавацца будзе надпіс SPRZEDAM. А хто яго, стражніка трасцяніцкіх рагатак, купіць — можа такі, каму ў смак будзе тая „Тшасцянка" або адрыгнецца яму тутэйшая мова? Ды што тут пра чужых! Мне ў сэрца коле крыўда на гэтых учарнелых ад смагі дзядзькоў, якія асмеліліся так азывацца да пажылога чалавека!.. Можа і добра, што благавата ўжо чуе.

Прыгадалася мне другая сустрэча з ім і з яго жонкай сем гадоў таму. Якраз былі пасля святкавання пяцідзесяцігоддзя шлюбу. Міхалу было 25, Ніне 17, калі звяла іх прыхільнасць іхніх дзядоў да „прарока Іллі". Вярнуўся быў Міхал з арміі з артылерыі, зараз і вяселле зрабілі. Сядзелі яны ў лістападзе 2003 года на канапе, а дзядзьку Міхалу не так хацелася бавіцца ўспамінамі пра сваё жыццё, а рваўся пра актыўнае трасцяніцкае былое распавесці. Падумала я, натхнёная чуткамі пра Трасцянку, ведаючы яшчэ пару асоб згэтуль, што можа ўсе тут такія, поўныя энергіі, незалежныя, з думкай пра агульныя справы. Было тут трохсот гаспадароў... Успомніў дзядзька Астроўка той 1973 год са змаганнем за асяродак здароўя. Які быў патрэбны ён у вёсцы! Пасля ліквідацыі Грамадскай рады застаўся пусты дом. Народ выслаў Міхала Астроўку ў дэлегацыю ў Міністэрства здароўя, каб гэты дом запрапанаваць цэлы на асяродак здароўя. Змаганне за асяродак аперлася ў сталіцу краіны, міністэрствы аховы здароўя і адукацыі, камітэты партыі, вельмі кранула гмінную ўладу. Народ станавіўся за Астроўкам. Называлі Міхала Астроўку „народным трыбунам", часам у насмешку, бо ў яго слоўніку прымяняліся словы „народ", „патрыятызм". Некаторыя лічылі яго, не вельмі вучанага чалавека, звычайным самазванцам...

Пасля чатырох гадоў гмінныя ўлады рашылі асяродак здароўя ліквідаваць (дзейнічаў усё ж да 2002 года). Міхал Астроўка зноў стаў у яго абарону. Вёска паднялася на ногі. Гэта быў ужо 1980 год. На „народнага трыбуна" з не заўсёды дыпламатычнай лексікай, яснай і народнай, улада паскардзілася ў суд, што ён псуе яе аўтарытэт, самавольна склікае сходы, зневажае ўладу. Людзі сціхлі. На партыйнай экзекутыве (Астроўка быў кандыдатам у ПАРП) крычалі: „Астроўка прабуе праставаць палітыку партыі, хацеў вырасці па-над рашэнні камітэта! Sieje zamęt!". Сакратар партыі заявіў, што „судовы разбор даказаў гарамадскую шкоднасць" дзеянняў Міхала Астроўкі і патрабаваў ад яго перапросін за „podważenie autorytetu".

А тут настала дэмакратыя і перапрашаць не было каго...

У гэты чэрвеньскі адвячорак 2009 года перад трасцяніцкай прадуктова-жалезнай крамай гарлапаняць наведвальнікі. Прабуюць ненавісна перакрычаць дзеда Міхала і запалохаць яго, каб мо нават і не ехаў на сход, скліканы войтам у сувязі з прапановай міністэрства адміністрацыі правесці кансультацыі сярод жыхароў у справе вяртання належнай назвы вёскі. З усіх бакоў ідуць насельнікі, некаторых, нядужых, падвозіць радная, каб выказаліся ў гэтай справе. Не даюць яму расказаць пра гісторыю са зменай, пра славутую гісторыю Трасцянкі. А ён настолькі стары, каб памятаць. Як учэпіста трымаліся трасцяніцкія людзі свайго, як змагаліся. Як, едучы ў бежанства, хавалі звон царквы архангела Міхаіла. Калі зазваніў гэты звон, на дзесятую вёску было чуць. Як зазвоніць на Вялікдзень — аглухнуць можна!

— Трасцянка была, ёсць і будзе! — кажа Міхал Астроўка. — Гэтую Тшасцянку выдумаў Максімчук Піліп, што жыў каля школы. Яму было больш за 20 гадоў. Я быў сведкам, ды ў мяне не пыталі, бо меў менш чым 18 гадоў. Гэта было ў 1946 годзе. Прыехаў агент і на сходзе сказаў, што мае быць польская назва. Можа быць „Тшасцянка" — спольшчыў сам Максімчук. Тая „Тшасцянка" невядома па-якому. Наша назва ад рэчкі. Той, хто выдумаў, сам уцёк у Беласток. Наш народ трасціною дахі крыў. Я злосны на Трасцянку, як так можна паддавацца? Ад'язджаючы ў бежанства, затапілі мы свой звон у затоцы ў Нарве. Забралі той звон у касцёл. Вярнуліся з бежанства: дзе звон?! Знайшлі, а ён *нападэнкнуты*. Пераплавілі той звон на два, і падзяліліся — прынеслі нам чарапок. Трасцяніцкі звон цяпер глухаваты, як бляшаны, бы ў патэльню б'юць. Мне 84 гады, я памятаю. Мяне не настрашыш.

Пасля сходу, на якім амаль усе трасцяніцкія бабы і мужыкі загарлапанілі за „Тшасцянкай", выехаўшы са святліцы-бібліятэкі-пажарніцкага дэпо пакалясіў дзед Міхал каля царквы, у бок Беластока, да свайго дому.

— Сорам вам, сорам вам, сорам вам! — галасіў пераплаўлены звон над Трасцянкай.

Зіма ўразіла

Натура любіць рабіць сюрпрызы. Надвор'е на зломе лістапада і снежня перамянялася як у калейдаскопе. Удзень, напрыклад, гулялі снежныя віхуры пры нулявой тэмпературы, а праз суткі тэмпература паніжалася да 26 градусаў са знакам мінус. У Чаромхаўскай гміне ў гэтым часе не было закалоту вакол расчысткі вуліц ад снегу. Дарогі былі праезнымі, а пры марозным надвор'і пасыпаны пяском. Праўда, у час мяцеліцы 2 снежня, калі праходзіла інаўгурацыйная сесія Рады гміны, зранку ўзнікла праблема ў дарожным руху, але кароткачасовая. На адвячорку рушыла тэхніка і расчысціла вуліцы. Горш было жыхарам прыгранічнай Апакі. Гміна зараз дарогі ў вёску не расчышчае, паколькі гэтая лічыцца павятовай. А Павятовае праўленне дарог у Гайнаўцы лічыць, што апацкім пенсіянерам некуды зімою швэндацца, таму з дапамогай для іх не спяшаецца. Солтыс вымушаны быў дабірацца на сесію ў Чаромху „з перасадкай" і пешшу брыў праз снежныя гурбы некалькі соцень метраў, пакуль перасеўся на другую машыну. Няўжо гмінны самаўрад пакіне жыхароў Апакі самім сабе ў цяжкі зімовы час? А мо Павятовае староства ў Гайнаўцы зварухне з месца адказных дарожных чыноўнікаў і вырашыць праблему прыгранічнай вёскі?...

(УС)

Гліняны хаўрус

Фота Т. ЦІХАНЮКА

Майстар-класы адбыліся дзякуючы датацыі Управы горада Гайнаўкі

4 снежня 2010 года маладыя гайнаўяне чарговы раз удзельнічалі ў працэсе інтэграцыі шляхам пазнавання лакальнай традыцыі і мастацтва ў рамках праекта „Прыгранічны этнічны хаўрус". Гэтым разам аб'ектам вывучэння была гліна. Вучні белгімназіі і адобвух гайнаўскіх ліцэяў удзельнічалі ў ганчарных майстар-класах у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы. Смельчакоў навучыцца працаваць пад вокам спецыяліста на ганчарным коле не бракавала. А ў ролі спецыяліста выступіў Міраслаў Пяхоўскі з Чорнай-Всі-Касцельнай — ганчар, сям'я якога з дзеда -прадзеда займаецца гэтым рамяством.

Іншую форму апрацоўкі гліны паказала група пад кірункам Тамаша Жукоўскага, які супрацоўнічае з мастацкай майстэрняй „Ліпавая" ў Харошчы (яна была госцем Музея ў верасні гэтага года).

Усім удзельнікам майстар-класаў, інструктарам і настаўнікам — Аліне Пятрашак і Яну Карчэўскаму — сардэчна дзякуем!

Аказалася, што ў Гайнаўцы не бракуе ганчарных талентаў... Толькі глядзець, як бабуліны дваяны вернуцца ў карыстанне. **А. ЦІХАНЮК**

„Вульчанкі" — незвычайны калектыў

Зараз да калектыву належаць 4 асобы. На здымку (злева): Вера Рошчанка, Валянціна Верамчук і Надзея Пашковіч (непрысутная тут Вольга Верамчук)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калектыў „Вульчанкі" з Вулькі-Тэрахоўскай, распаложанай непадалёк ад Чаромхі і мяжы з Беларуссю, гэта асаблівая вакальная група на фоне нашых калектываў з Беласточчыны, маючы на ўвазе напевы іх песень. Паводле спецыялістаў, гэтыя напевы характэрныя тэрыторыям, распаложаным зараз у Рэспубліцы Беларусь, і не было ў нас іншага калектыву, які трымаўся б выканаўчай манеры „Вульчанак". Цешыць, што гэты незвычайны, у сэнсе прэзентаванага рэпертуару, калектыў дачакаўся юбілею 30-годдзя сваёй дзейнасці. Хаця зараз спявачкі з Вулькі-Тэрахоўскай ужо ў старэйшым узросце і апошнім часам змагаліся з цяжкасцямі, не здаліся і надалей маюць ахвоту выступіць са сваімі непаўторнымі песнямі.

— У заснаваным восенню 1980 года калектыве спачатку выступалі Ліля Назарук, я, Лідзія Шакала, Анна Андрасюк, Марыя Стэльмашук, Анна Назарук, Вера Рошчанка і Вольга Верамчук, — расказвае, гледзячы на здымак зроблены ў 1982 годзе ў час фестывалю „Беларуская песня", кіраўнік „Вульчанак" Валянціна Верамчук. — З прапановай заснаваць калектыў выйшаў да нас Ян Крупа. Але спачатку мы самі збіраліся і развучвалі першыя песні, з якімі выступілі на раённым аглядзе фестывалю „Беларуская песня", што праходзіў у Дабрывадзе. Аднак тады яшчэ не трапілі мы ў Беласток, куды паехалі ў 1982 годзе і з цэнтральнага агляду „Беларускай песні" вярнуліся ўжо з узнагародай (хіба, занялі тады другое месца). У 1983 годзе мы паехалі ў Беласток з тэатральнай сцэнкай „Каравай". На цягніку ехалі мы з мётламі і капанькамі, а пасля з усімі рэквізітамі ішлі пяшком з вакзала ў памяшканне БГКТ па вуліцы Варшаўскай, каб там паказаць наша прадстаўленне. З гэтага часу мы штогод ездзілі на фестывалі „Беларуская песня" і часта займалі там прызавыя месцы. З часам старэйшыя сталі адыходзіць з калектыву, а іх месца займалі малодшыя асобы. Выступалі з намі Галіна Шакала, Галіна Зінчук і Зоя Зінчук, а па сённяшні дзень належыць да калектыву Надзея Пашковіч.

У мінулым з калектывам „Вульчанкі" займаліся інструктары Міхал Вішанка і Сцяпан Копа.

— Міхал Вішанка рыхтаваў нас да ўдзелу ў фестывалях „Беларуская песня", а таксама падрыхтаваў абрад „Каравай". А Сцяпан Копа сачыў, каб мы развучвалі нашы даўнія песні, — кажуць жанчыны з Вулькі. — Пазней мы ўжо самі рыхтавалі рэпертуар, а апошнім часам дапамагала нам дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе Барбара Самасюк.

Калектыў „Вульчанкі" часта выступаў на фэстах у Чаромсе, Гайнаўцы і ў іншых мясцовасцях.

— Пазней, куды нас запрашалі, туды мы і ехалі, а гміна давала нам аўтобус. Апрача мясцовых фэстаў мы выступалі на „Купаллях" у Белавежы і Нараўцы, дзе спаткалі прэм'ер-міністра Уладзімежа Цімашэвіча. Далей ад дому выступалі мы ў Мельніку, Драгічыне, Сувалках, Чорнай-Беластоцкай, каля возера Вігры ці ў Сопаце, а за мяжой — у Маларыце на Беларусі і ў Луцку на Украіне, — успамінае кіраўнік Валянціна Верамчук, якая з калектывам правяла 30 гадоў. — Апошнім часам мы пабывалі на аглядзе абрадаў у Гайнаўцы, на калядных аглядах і некалькі разоў спявалі на мерапрыемствах у Студзіводах — на фестывалях „Там по маёвуй росі" і „Олень по бору ходіт".

Пра выступы „Вульчанак" у Студзіводах успамінае дырэктар фестывалю „Там по маёвуй росі" Дарафей Фіёнік і вельмі станоўча ацэньвае спеў жанчын з-пад Чаромхі.

— Калектыў „Вульчанкі" вельмі арыгінальны і гэтым самым незвычайны. Характэрнымі песнямі „Вульчанак" з'яўляюцца рагулькі, а вульчанскія напевы гэтых песень і іншых абрадавых твораў можна зараз пачуць толькі ў Вульцы-Тэрахоўскай, Ставішчах, Хлявішчах (гэтая вёска апынулася за мяжой, але ў Польшчы застаўся ад яе хутар) і далей за мяжой, пад Кобрынам, ці Камянцом у Рэспубліцы Беларусь. З такімі напевамі, як у выкананні „Вульчанак", спявалі на нашым студзіводскім фестывалі калектывы з-пад Жабінкі, ці Лісоўчыц. Вулька і Ставішчы належаць да іншай фальклорнай, моўнай, а нават і гістарычнай зоны, чым Чаромха і іншыя навакольныя вёскі гэтай гміны. Паміж Вулькай-Тэрахоўскай і Чаромхай праходзіла мяжа, якая раздзяляла Вялікае Княства Літоўскае і Карону, а таксама Брэсцкую і Бельскую землі. Цяпер не трэба ехаць на Камянеччыну, бо характэрныя для гэтага рэгіёна мову і напевы песень можна пачуць якраз ад „Вульчанак". Нават Вулька-Тэрахоўская паўстала на аснове маёнтка Тэрахі, што быў распаложаны на тэрыторыі, якая зараз знаходзіцца ў Рэспубліцы Беларусь, — расказвае гісторык, фалькларыст і дырэктар фестывалю „Там по маёвуй росі" Дарафей Фіёнік. — „Вульчанкі" выступаюць з аўтэнтычным неапрацаваным фальклорам, свае песні спяваюць добра дабранымі, зладжанымі галасамі.

„Вульчанкі" заяўляюць, што найчасцей спяваюць свае песні, з Вулькі-Тэрахоўскай. Але ёсць у іх рэпертуары творы з іншых вёсак, напрыклад, з Круглага, адкуль прыехала Анна Андрасюк, ці з Хлявішчаў, адкуль прыбыла Зоя Зінчук. Цяпер „Вульчанкі" выступаюць, між іншым, ва ўборах, пашытых у Мінску, якія атрымалі з дапамогай БГКТ і войта Чаромхі Міхала Врублеўскага.

— Многа выступалі мы з рагулькамі і іншымі абрадавымі песнямі. Мы бачым, што спяваем і гаворым так, як у Ставішчах. У вёсцы Чаромха ўжо іншыя напевы песень. Многа нашых песень запісаў ад нас Сцяпан Копа, а нядаўна запісвала наш спеў Анна Фіёнік. Нашы песні запісаны на кампакт-дысках з творамі з мерапрыемстваў ладжаных у Студзіводах і на асобнай аўдыёкасеце. Мы вельмі любілі спяваць, а песня гэта нашае жыццё, — гаворыць Валянціна Верамчук.

У Вульцы-Тэрахоўскай была доўгая традыцыя спявання.

— Калі маладымі мы пасвілі кароў, то тады ўжо многа спявалі, а нашы мамы, а пасля і мы таксама, на лавачках спявалі, — кажуць Вера Рошчанка і Надзея Пашковіч.

— Раней так хацелася нам спяваць, што пакідалі дома работу і на выступы ехалі, а пасля і ўсю работу дома рабілі. Пазней дзеці нас выручалі, але бывала, што і сваркі дома былі з-за нашых выступаў, — кажа Валянціна Верамчук. — Зараз мы ў хоры спяваем, у нашай царкве, збудаванай на могілках. У калектыве асталося нас чатыры жанчыны — Вера Рошчанка, Надзея Пашковіч, Вольга Верамчук і я. Спяваць надалей хочацца, але здароўе ўжо слабаватае і ў нагах круціць. Яшчэ можа да Дарафея Фіёніка пад'едзем на фестываль, а можа ў сябе выступім, бо прыгожа адрамантавалі ў нас святліцу.

Вёска Вулька-Тэрахоўская — прыгожае сяло з многімі мураванымі дамамі, збудаванымі ў перыяд хуткага развіцця чыгункі, бо на ёй практычна працавалі людзі з кожнай хаты ў Вульцы, таксама мужы маіх субяседніц. Зараз пад гэтае сяло набліжаецца лес, а многа вульчанскіх зямель ляжыць аблагом. Пра хаты дбаюць яшчэ пенсіянеры, што тут пражываюць, і іх сямейнікі.

Лявон Байко з жонкай Янінай і дачкой Евай Данелюк

фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Міхал МІНЦЭВІЧ

З месца на месца

З канцом вайны з Белавежы ў Орлю перасялілася каля дзесяці сем'яў, м.інш. Банькоўскія, Данелюкі, Байкі, Галёнкі. Лявон Байко, 1920 года нараджэння, захаваў выдатную памяць пра жыццё пры санацыі, у час акупацыі і пасля вайны. Размову з ім запісаў я на магнітафонную плёнку ў 2008 годзе; восенню наступнага, 2009 года яго не стала ў жывых.

Вучыўся ў Белавежы

Жылі мы — бацькі Надзея і Міхал, брат Пётр і я — сем кіламетраў за Белавежай, на калёніі Чадзель. У белавежскую школу я даязджаў, а зімою жыў у цёткі Вольгі Смактуновіч. Калі на гаспадарцы была работа, я аставаўся дома.

Цётка была фельчарам, працавала разам з доктарам Лаўрыновічам. (Паводле Пятра Байко, у канцы 1919 года Вольга Смактуновіч арганізавала амбулаторыю ў драўляным будынку пры царскай электрастанцыі, якую ў 1922 годзе перанеслі ў будынак па Броўскай дарозе, дзе паўстаў таксама заразны шпіталь; у прыватным доме Вольгі Смактуновіч знаходзілася аптэка, а яна, апрача працы акушэркай, вяла таксама прыватны дантыстычны кабінет — М. М.) Цётка абслугоўвала цэлую Белавежскую гміну, усіх рабочых, чыноўнікаў, яўрэяў. Калі яна ставіла дыягназ, што хворы яўрэй не акрыяе, яго больш не лячылі, бо давяралі ёй.

Настала вайна

Да вайны была ў нас гаспадарка. У 1939 годзе прыйшлі сюды немцы, закруціліся і адступілі за Буг, саступіўшы саветам. У 1941 годзе немцы напалі на рускіх і пагналі іх. Немцы сталі вывозіць жыдоў, ды і нас выдварылі ў Шарашова. Акупанты прыехалі на матацыклах і загадалі ў дзве гадзіны загрузіцца на фурманкі, не інфармуючы пра напрамак вывазкі. Але што ж можна загрузіць на дзве фурманкі? А ў гаспадарцы ўсё патрэбнае. Забралі дзежку на хлеб і бочку з мясам — акурат былі закалолі свінчо, мяшок мукі. Дзве фурманкі грузілі, бо ў нас і свая была. А тыя, што па нас прыехалі, не надта былі ахвотныя на свае вазы грузіць. Ад'ехалі мы каля кіламетра, калі над нашымі будынкамі ўзвіўся агонь. Спалілі ўсю калёнію, каб не была апірышчам для партызан. І пасля нельга было наведваць Чадзеля без дазволу камісара.

У Шарашове пасялілі нас у былых жыдоўскіх будынках, бо яўрэяў вывезлі раней у пружанскае гета. Трэба было брацца за нейкую работу, а з гэтым было складана. Атрымаў я працу ў магазіне Рэйфейзен у Шарашове. Сяляне здавалі там кантынгент, а мы рыхтавалі мяшкі, насыпалі ў іх збожжа і пасля грузілі на вагоны вузкакалейкі для адпраўкі ў Белавежу.

Маю цётку Вольгу Смактуновіч немцы вывезлі аж у Аранчыцы, сем кіламетраў за Пружанамі. Аднак яна пасля наняла фурманку і вярнулася да нас, у Шарашова, жыла з намі па-суседску. Ейнага мужа немцы забралі з дому і па сённяшні дзень невядома, што з ім сталася; мабыць, расстралялі яго на жвіроўні паміж Белавежай і Пружанамі — там многіх людзей расстрэльвалі.

Жылі мы ў Шарашове да канца вайны, да 1945 года. Калі немцы адступілі, тады саветы ўстанавілі на Белавежы граніцу. Нашага бацьку Міхала недзе пасля жніва саветы саслалі ў Сібір, палічыўшы яго „ворагам народа". Адтуль бацька прыслаў быў картачку — толькі адзін раз. А праз месяц прыйшло з ваенкамата паведамленне пра смерць бацькі. Не было нам чаго аставацца ў Шарашове і мы ўсе рэпатрыяваліся ў Белавежу. Маці з братам у Белавежы асталіся, а я прыблукаўся ў Орлю.

У Орлі

14 ліпеня 1945 года я ажаніўся. А сталася гэта так: у Орлі быў ветэрынар Станіслаў Маліноўскі, ён з нашых старон паходзіў і мы зналіся. Заходзіў я да яго і па нейкім часе паліцыянт Скоўран зачапіў мяне, што я там задоўга жыву без прапіскі. Ну то я пайшоў прапісацца. А там такая „сінічка" па гміне лётае, то туды, то сюды. А я вочка раз-другі выпушчу; і так мы пазнаёміліся. Яна, Яніна Рыбак, была касіркай, а ейная сям'я прыехала ў Орлю аж з Тлушча, што каля Варшавы. А трэцяй гадзіне я прыходзіў у гміну і адводзіў яе дадому. А дома будучая цешча абед дачцэ рыхтавала, дык і я сілкаваўся. Пачалося гэта ў сакавіку, а ўжо ў ліпені быў шлюб. Праз нейкі час перабралася да нас мама з братам — ён таксама ажаніўся з арлянскай дзяўчынай.

У яўрэя

Сталі мы жыць побач кафлярні, у будынку з чырвонай цэглы, які раней пабудаваў майму цесцю ўладальнік кафлярні яўрэй Шмулька Вайштын. Ён, Вайштын, быў пільна патрабаваў спецыяліста па выпальванні кафлі і напісаў у Тлушч да цесця, Вацлава Рыбака, каб той прыехаў у Орлю, абяцаючы яму добрыя грошы. Спярша Вацлаў прыехаў сам, паездам, выпаліў адну-другую печ і той Вайштын кажа: „Ma Pan u mnie robotę, 150 złotych miesięcznie, mieszkanie i opał". Цесць згадзіўся і перабраўся ў Орлю з цэлай сям'ёй — жонкай і чацвёркай дзяцей.

Пасля вайны

Пры немцах у кафлярні падобна выраблялі толькі дрэнажныя трубкі. Большасць прыбораў параскрадалі мясцовыя людзі. Калі пасля вайны сталі ўзнаўляць вытворчасць у кафлярні, тады яе адноўнікі — у іх ліку і мой цесць — сталі хадзіць па вёсках (Міклашы, Кашалі) і шукаць старых формаў, штампаў. Са старых будынкаў кафлярні астаўся толькі адзін драўляны, пабудаваны са знесеных былых жыдоўскіх дамоў, дзе немцы мелі стайню. Пасля вайны ў тым будынку размясцілі формы, зрабілі лавы, печы і пачалі выраблять кафлю. Адсадачны басейн (частку кафлярні) пачаткова прыводзілі ў рух конай цягай, пасля спецыяльным рухавіком. Шлам прапускалі праз сіта, адкіды выкідалі, а чыстая гліна ішла на кафлю. Гатовую кафлю раней вазілі на чыгуначную станцыю ў Рыгораўцы, а пры камуне — у Бельск. Брук, пакладзены пры немцах, быў толькі з Орлі да Вулькі, а кафлю ў Бельск вазілі праз Шчыты і Галады. Дарэчы, усе самаходы ездзілі тым маршрутам да часу рамонту карацейшай дарогі ў Бельск цераз Парцава.

Работнікі кафлярні на фоне „канюшні" пад канец 1940-х гадоў. Другі справа — Вацлаў Рыбак

Ці выжылі жыды?

Калі я прыехаў у Орлю, то ўжо тых жыдоў, што былі ўласнікамі кафлярні, не было; пра іх ведаю толькі з расказаў цешчы і цесця. Калі ў 1939 годзе насталі саветы, то Шмулька, Срулька, Ёсля і Абрамка Вайштынаў арыштавалі і вывезлі ў брэсцкую крэпасць. Іх сем'і, якія саветы вывезлі ў Сібір, перажылі. Сын Шмулька, Айжык, трапіў у войска, быў паручнікам, ваяваў недзе тут і быў паранены. Тых жыдовак сустрэў я ў 1945 годзе, калі яны вярнуліся з Расіі і прыехалі ў Орлю. Пабачылі яны тое, што з іхніх маёнткаў асталося. У нас быў конь, то я запрог яго ў фурманку і завёз іх у Бельск. А пазней напісалі яны цесцю, што з Варшавы цераз Францыю — бо яны там, мабыць, мелі ў банках грошы — выехалі ў Ізраіль і там пасяліліся. Патомкі Айжыка наведалі Орлю недзе ў 1980-х гадах. Магчыма, што Люцыне Лапінскай (з роду Пішчатоўскіх), якая да вайны была ў Вайштынаў служанкай, прывезлі нейкі падарунак.

Ці бываю ў Белавежы? Наведваю магілы; там спачываюць мае бабуля, цёткі, дзядзькі, дваюрадны брат. Бабуля Разанка была з трыма сынамі ў бежанстве, пасля вяртання жыла разам з унучкай у нейкай вёсцы каля Пружан; памерла, пражыўшы 112 гадоў. А мая мама без пяці дзён пражыла сто гадоў, яе пахавалі ў Орлі.

Васількаў

Па гарачых слядах

9 снежня г.г. з'ездзіў я ў Васількаў (Беластоцкі павет). Сюды можна дабрацца аўтобусамі беластоцкай гарадской камунікацыі — лініяй № 100. З Васількава ў цэнтр Беластока аўтобус едзе 20 хвілін.

Мяне ашарашыў выгляд аўтобуснага прыпынка за царквой у Васількаве. На ім стаіць цёмна-чырвонага колеру даволі высокі драўляны дашок на чатырох слупах і з міні-вежай наверсе. На лавачках фарбу даўно сцерлі. На слупах надпісы ды разьба па дрэве і рысункі дамарослых мастакоў, між іншым выява голай дамы. Лёгка здагадацца, адкуль у рысавальшчыкаў тое натхненне і ахвота маляваць. На прыпынку стаяць дзве сметніцы, але недакуркі цыгарэт усцілаюць ля іх абледзянелую сцежку. Тут жа ля царкоўнай агароджы на снезе ляжалі фольгавыя пакеты з макулатурай і рознай папяровай упакоўкай ды пустая бутэлька з наклейкай „Gorzka żołądkowa". Ляжала гэта зранку і да ночы. Ніхто не прыбраў.

Аўтобусны прыпынак у цэнтры Васількава знаходзіцца непадалёк ад пастарунка паліцыі. Але апісаных непаладкаў паліцыянты не прыкмячаюць. А зараз і курыць на аўтобусных прыпынках забараняецца. Але не ў Васількаве. Па ўсім відаць, што і піць алкаголь тут таксама... не забараняецца. Вось як, вось так.

Забралі дошку аб'яў

У Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна) стаялі дзве дошкі аб'яў. Дзве і зараз стаяць у суседнім Старым Ляўкове. У Новым Ляўкове цяпер асталася адна. Навейшую дошку забралі. Магчыма, што за згодай войта перавезлі яе ў іншую вёску. Новая дошка аб'яў была пастаўлена на скрыжаванні дарог ля крамы і цяпер закрытай злеўні малака. Знікла яна яшчэ перад нядаўнімі самаўрадавамі выбарамі. Чаму?

Вёска Новае Ляўкова доўгая і патрэбны дзве дошкі аб'яў. У краму прыходзяць жыхары пасёлка за пакупкамі. Тут яны маглі б прачытаць аб'явы, між іншым з Гміннай управы. Дык чаму забралі адтуль дошку?

(яц)

АБ'ЯВЫ

Аб'яднанне «АБ-БА»
сардэчна запрашае
на спектакль



«Ой, давно, давно»
(Беларускія гісторыі з Падляшша)

у выкананні ўдзельнікаў праекту «Падляшскія хронікі».
18.12.2010 г. у 17.00
Пачатковая школа № 4
у Беластоку
вул. Чэнстахоўская 6а

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

З сімпатыяй пра Беларусь!

Фота Ганны Кандрацюк

Пяты „ц” клас з настаўніцамі Валянцінай Бабулевіч і Міраславай Маркевіч

— А ці ўмее пані гаварыць папольску? — спыталі мяне вучні з Бельска-Падляшскага. І ці жыву я ў Беларусі?

Такія пытанні ўзніклі пасля майго выступлення ў класах пятым „ц” і пятым „д”, дзе часта мы „перасякалі” беларускую мяжу. Самым блізкім і цікавым месцам для многіх падляшоў з'яўляецца Белавежская пушча. Так пра нашу пушчу думаюць многія дзеці. Чаму? У апошнія гады многія з нашых сяброў пабывалі ў Памесці Дзеда Мароза. Туды, пад самы двор, прыходзяць зубры, якія ў пушчы жывуць на волі. Таксама, па дарозе ў казачны двор, часта ўбачым як паміж старых дрэў прахаджваецца статак дзікоў або сарнаў. Дзікая жывёла не баіцца людзей, яна нават не звяртае на іх увагі. Магчыма, спрыяюць гэтаму рэзкія законы, паводле якіх нельга самастойна хадзіць па лесе. У Памесце Дзеда Мароза турыстаў давозяць на спецыяльным транспарце. Непадалёк казачнага двара знаходзіцца таксама зона рэдкай расліннасці. Там, між іншым, сустрэнем раслінку пад цікавым назовам *венерын чаравічак*. Спачатку, калі мы спыталі пра гэтую раслінку, вучні прыдумвалі дзівосныя прадметы і месцы. Аказваецца, зусім не ведаем беларускіх назоваў раслін, птушак, насякомых. У рэшце рэшт правільны адказ, што венерын чаравічак гэта расліна, знайшла Дамініка Юрковіч.

Венерын чаравічак

— Мой бацька часта ездзіць у Беларусь, — кажа Міхась Красуцкі, — у Белавежскую пушчу.

Міхась фанат футбола. Хлапец іграе у маладзёвай футбольнай камандзе „Тур”. Кажа ён, што найбольш падабаюцца яму матчы, калі перамагаюць мацнейшых за сябе!

Нам прыемна адзначыць, што нашы бельскія сябры чакалі сустрэчы з „Зоркай”. У класах пятым „ц” і пятым „д” многа выдатнікаў. Паколькі нядаўна завяршыўся школьны этап прадметнага конкурсу, настаўніцы Міраслава Маркевіч і Валянціна Бабулевіч назвалі сваіх лаўрэатаў. Сярод іх апынуліся Юстына Марчук, Ева Авярчук, Мартына Швед, Віялета Дработка. Прыемна адзначыць, што першая вучаніца — з інтэграцыйнага класа. Юстына прыгожа размаўляе па-беларуску і ведае многа беларускіх слоў, адразу бачны яе моўныя здольнасці. Вялікай папулярнасцю ў класах карыстаецца конкурс „Роднае слова”. У мінулым годзе аж палова вучняў пятага „д” класа прымала ў ім удзел. Сустрэча ўразіла мяне з-за сімпатыі і ўвагі ў бок беларускай мовы і прыроды. І яшчэ таму, што амаль усе нашы сябры падпісваюцца на „Зорку” і карыстаюцца ёю на ўроках, ды ахвотна ўдзельнічаюць у нашых конкурсах. Таму ў Бельск-Падляшскі я паехала як Санта Клаўс, з мяшком узнагарод. Узамен нашы сябры прадставілі прыгожыя партрэты для галерэі „Зоркі”. У час сустрэч я адчула ў нашых сяброў вялікую сімпатыю да Беларусі і цікава, што яна заўсёды спалучалася з уласнымі бабулямі і дзядулямі, а часам нават з прабабкамі...

ЗОРКА

Галерэя ЗОРКІ

1. Імя і прозвішча: Міхал Красуцкі (V „ц” клас Комплексу школ з беларускай мовай навучання № 3 у Бельску-Падляшскім).

2. Твой любімы прадмет: фізкультура.

3. У жыцці хачу стаць: футбалістам.

4. У сяброў цаню: дабрыню, паслужлівасць, шчырасць.

5. Не люблю: некаторых урокаў.

6. Па-беларуску размаўляю: з мамай, бабуляй і дзедам, прабабкай.

7. Кніжка, якая цябе захапіла: „Новыя прыгоды Нікаля” Рэнэ Гасціннага.

8. Падабаецца табе музыка: рап, гіп-гоп, тэхна.

9. Твае ўлюбёныя стравы: многа іх у мяне.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю гуляць у футбол, разыгрываць матчы і перамагаць мацнейшыя дружыны.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Беластоку, бо гэта не замалы і не завялікі горад.

Фота Ганны Кандрацюк

Надзея Сторажава

Чароўныя чаравікі

Чараўнік нам даў
Для Вікі
Чырвоныя чаравікі.
Левы, правы — роўныя
І, казаў, чароўныя.
Хутка ходзяць,
Лёгка скачуць.
Зблытай іх —
Яны заплачуць.

Кожны робіць
Сваю справу,
Левы — злева,
Правы — справа.

Як грузіны пасяліліся ў рай

(*грузінская легенда*)

Гэта было ў тыя часы, калі Бог стварыў зямлю і паклікаў да сябе людзей, каб іх справядліва размясціць у паасобных краінах. Усявышні ведаў, што калі сам не навядзе парадку, народы, раней ці пазней, пазабіваюцца насмерць. Вядома, калі людзі сабраліся, дык кожны хацеў узяць сабе найлепшы кавалак, дзе ўраджайная зямля, лясы поўныя звярыны і пчаліных дуплаў, рыбныя рэкі. На пляцы запанаваў закалот і дзікі вэрхал. Бог не мог дапусціць, каб народы скакалі адзін перад другім. Ён строга загадаў усім стаяць у чарзе, якая доўжылася аж па далягляд. Тым часам народ *картлаў*, як завуць сябе грузіны, сам адступіўся ад чаргі. Яны не хацелі таўчыся сярод агрэсіўнага натоўпу, пхацца, распіхацца локцямі і сварыцца. Грузіны адышлі набок ды прыселі ў прыемным халадку пад старым раскідзістым дрэвам. Яны дабылі свае напіткі і завялі свае чароўныя песні і прыемную гутарку пра сяброўства і мір. І калі так бавілі час на прыемнай бяседзе, забыліся для чаго паклікаў іх на вялікі пляц Бог. Яны нават не прыкмецілі, калі людзі набралі дабра ды разышліся па сваіх месцах. Іх спевы пачуў Усявышні. Ён падышоў да кампаніі і спытаў:

— Вы, відаць, атрымалі найлепшы кавалак зямлі, што так сабе тут балюеце? Прыемна бачыць задаволеных людзей!

— Дык не! — уздыхнуў найстарэйшы ў грамадзе. — Мы нешчасліўцы...

Толькі цяпер грузіны ўсвядомілі сабе, што праз свае спевы і бяседы праваронілі свой шанц на ўласны кавалак зямлі. Ім стала сумна, з вачэй пацяклі слёзы.

kulturalna.warszawa.pl

— Дык што мне рабіць з вамі, — падумаў уголас Бог. — Уся зямля ўжо раздадзеная.

Усявышні любіў грузінаў за іх мірны і добры характар, належным чынам ацэньваў таксама іх неахвоту змагацца ў натоўпе за найлепшы кавалак зямлі. Яму спадабалася сціпласць грузінаў. Ён пастаяў, пачухаўся ў голаў і не ведаў што зрабіць з гэтым народам:

— Што мне рабіць з вамі? Я раздаў ўсё, што ў мяне было, а тое, што асталося, дык затрымаў сабе, каб там адпачываць. Ну, але ж шкада мне вас. Народ без зямлі не народ! Яго штурхаюць з кожнага боку, зневажаюць, нішчаць...

Бог падумаў і сказаў так:

— Ну добра. Тады аддам вам той райскі куточак, які я захаваў сабе. Хай будзе вам домам. Бывайце здаровы, жывіце вясёла як у час, калі я дзяліў зямлю, а вы не пхаліся, як якія падсвінкі, па найлепшы кавалак торта!

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Сланечнікавы чацвер

фота by Step

Дасвяточны перыяд гэта не толькі час чакання Каляд, але і плённы час для беларускай культуры. Паяўляюцца новыя кніжкі і музычныя альбомы. Здаўна чаканы дыск Алега Кабзара і Надзеі Артымовіч паявіцца яшчэ ў „Музыцы з кайфам", а сёння вяртаемся да чацвярга, 9 снежня, калі ў беластоцкім клубе „Адэон" расцвілі сланечнікі.

У зімовы час вельмі складана знайсці жывыя сланечнікі, таму паяўляліся рысункі, кніжкі са сланечнікамі, семкі сланечніка і насёны. Усё гэта, каб атрымаць новы альбом гурту „Ilo&friends". „Сланечнікі", бо так называецца альбом, гэта выбар песень, якія паявіліся ў рэпертуары гурту за апошнія тры гады, бо тады з'явіўся першы альбом „Па дарозе". Выступ быў заадно святкаваннем дня народзін гурту, якому ў гэтым годзе споўнілася пяць гадоў. Была гэта ідэальная нагода вярнуцца да вытокаў, у якіх была Мажэна Русачык, зараз навуковы працаўнік. Яна была першым гітарыстам гурту і з нагоды малога юбілею вярнулася на супольную сцэну. На час выканання пару песень гурт налічваў пяць сугучных асоб.

Гучанне новага альбома напэўна адрозніваецца ад папярэдняга. Больш моцных, электрычных гукаў, сярод якіх, здаецца, не губляецца ўражлівасць на беларускае слова. Слухаючы песень, можна пазнаваць майстроў беларускай літаратуры, сярод якіх Анатоль Сыс, Уладзімір Караткевіч ці Уладзімір Някляеў. Новы альбом гэта таксама новыя „фрэндсы". На альбоме можам пачуць упершыню адзін твор у суправаджэнні фартэпіяна, на якім іграе Ігар Лукашук (для часткі з вас напэўна вядомы як настаўнік, але гэта і арганізатар „Бардаўскай восені "), а многія песні ўпрыгожыў сваімі гукамі беластоцкі саксафаніст Клаўдзій Багусловіч. Ці варта паслухаць гэты альбом — найлепш ацаніць самому. Як гэта зрабіць? **Дасылайце ВЕРШЫ ПРА СЛАНЕЧНІКІ на адрас „Зоркі", а за гэта атрымаеце ў падарунку дыск „Сланечнікі"!!!** Чакаем вашых твораў і рыхтуем ужо канверцікі з дыскамі.

i_basovka@o2.pl

Рэдакцыя „Зоркі" кіруе словы падзякі нашым спонсарам узнагарод: спадару Марку Тапалеўскаму з Бельска-Падляшскага, музычнаму гурту „ilo&friends", ды Цэнтру грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Галерэя ЗОРКІ

1. Імя і прозвішча: Аня Чыквін (пяты клас ПШ Комплексу школ № 2 у Гайнаўцы).

2. Твой любімы прадмет: матэматыка.

3. У жыцці хачу стаць: лекарам.

4. У сяброў цаню: калі можна з імі пагаварыць пра свае справы.

5. Не люблю: плятарства.

6. Па-беларуску размаўляю: з бабулямі, на ўроках беларускай мовы.

7. Кніжка якая цябе захапіла: „Маленькі Нікаля" Рэнэ Гасціннага („Przygody Mikołajka").

8. Падабаецца табе музыка: такая, якую знаходжу ў камп'ютары.

9. Твае ўлюбёныя стравы: бульба фры, салаткі.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: адпачываю ля камп'ютара.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Гайнаўцы. Чаму? Каб было блізка да бацькоў.

Польска-беларуская крыжаванка № 51

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 47:

Як, рапс, сава, дзядоўнік, зяло, Ніна, лік, князь, бібліятэка. Дзікі, дзяк, ял, радок, поўня, ніз, сінь, рака, катэдра.

Узнагароды, навейшую кнігу Віктара Шведа „Адплываем з Мора", выйгралі **Крыстыян Грушэўскі, Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Крыстыян Паскробка** з Нарвы, **Магда Міхалевіч, Мартына Швед, Наталля Тамчук, Вікторыя Артэмюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Новае выданне

Сяргей ЧЫГРЫН

„ACTA ALBARUTHENICA” З АЛЕСЕМ БАРСКІМ

Кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта выдала свой чарговы, дзесяты ўжо, штогоднік „Acta Albaruthenica”. Ён прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння доктара філалагічных навук прафесара Варшаўскага ўніверсітэта Аляксандра Баршчэўскага, літаратурныя творы якога мы ведаем і чытаем пад псеўданімам Алесь Барскі.

Свой юбілей Аляксандр Баршчэўскі адзначыў сёлета 2 лістапада. Нарадзіўся ён на Беласточчыне ў вёсцы Бандары, пра якія так і пісаў: „Мае Афіны тут — назваў іх Бандарамі”. Амаль 30 гадоў быў загадчыкам кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта, 21 год кіраваў беларускім літаратурным аб’яднаннем „Белавежа”. Аўтар шматлікіх кніг паэзіі, навуковых артыкулаў і перакладаў.

Вялікі 10 том „Acta Albaruthenica” адкрываецца артыкулам Міхася Тычыны „Лірыка Алеся Барскага і Афіны Аляксандра Баршчэўскага”. Крытык спыніўся на вобразе сонца ў вершах Алеся Барскага, на крэда Алеся Барскага-паэта і Аляксандра Баршчэўскага-грамадзяніна, падкрэсліўшы пры гэтым, што крэда „застаецца нязменным, нягледзячы ні на што: быць самім сабой, абараняць права беларускай меншасці ў Польшчы на сваю мову і культуру, верыць у тое, што ідэя ўзаемнай нацыянальнай і светапогляднай талерантнасці на карысць і палякам, і беларусам, працаваць, як працаваў больш за паўстагоддзя дагэтуль „над засыпаннем пропасці паміж палякамі і беларусамі”, узводзіць „мост паміж нашымі народамі”, вучыцца „творчага нацыяналізму ў палякаў”.

Міхась Тычына літаратурны позірк спыніў на інтымнай лірыцы Алеся Барскага, заўважыўшы, што інтымная лірыка паэта выразна выяўляе яго павышаную чуласць да эстэтычнай катэгорыі прыгажосці, увасобленай Творцам сусвету ў вобразе жанчыны.

Ірына Бароўская ў сваім артыкуле „Песня і малітва: лірыка Алеся Барскага” ўпэўнена, што найбольш яскрава ўвасобіў у сваёй творчасці Алесь Барскі — гэта купалаўскія традыцыі песеннасці мастацкага вобраза. „Як ніхто іншы, — разважае Ірына Бароўская, — з беларускіх паэтаў Алесь Барскі стварыў уласную краіну-браначку, якая сталася ўвасабленнем мараў усіх беларускіх песняроў усіх эпох — бо тут зямля спявае”. Сапраўды, у паэтычным сусвеце Алеся Барскага бязмежна пануе песня, якой, у поўнай адпаведнасці з арфічнымі законамі, падпарадкавана ўсё жывое. Янка Купала ўсклікаў, што ён песні беларускай уладар. Песня Алеся Барскага — валадар сусвету. Бо ўсё ёй падуладна: яна можа разам з касою зваліць распаленае лета, спеў луга данесці ў знямозе, ускалыхнуць зямлю і неба, узварушыць лес і г.д.

У „Acta Albaruthenica” № 10/2010 надрукавана і шмат іншых артыкулаў па літаратуры, мове, культуры і гісторыі. З цікавымі матэрыяламі выступаюць не толькі беларускія літаратуразнаўцы і гісторыкі, але і польскія, украінскія, рускія. Тым не менш, тэматыка беларускіх аўтараў даволі разнастайная і навукова абгрунтаваная, сур’ёзная і новая. Ірына Бурдзялёва, напрыклад, падводзіць вынікі мастацкіх пошукаў у кнізе-дзённіку Максіма Гарэцкага „Скарбы жыцця”. Мікола Хаўстовіч даследуе вытокі фантастыкі Яна Баршчэўскага. Даследчык сцвярджае, што выкарыстанне Янам Баршчэўскім народнае фантастыкі — гэта мастацкі прыём пісьменніка, неабходны яму дзеля ўвасаблення пэўнай ідэйна-эстэтычнай канцэпцыі.

Доктар філалагічных навук Сяргей Кавалёў знаёміць чытачоў з самым вядомым паэтам Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу Міколам Гусоўскім у артыкуле „Мікола Гусоўскі — феномен творчасці і парадоксы рэцэпцыі”. На думку аўтара, феномен Міколы Гусоўскага бачыцца менавіта ў яго „поліэтнічнасці” і „шматкультурнасці”, у плённым функцыянаванні як пісьменніка на памежжы двух культур арэолаў (усходне-візантыйскага і заходне-лацінскага) і ў прыналежнасці адразу да некалькіх нацыянальных літаратур, якія ўзыходзяць да багатай шматмоўнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага. А яшчэ феномен Міколы Гусоўскага — гэта ў першую чаргу феномен „Песні пра зубра”, унікальнага твора, які ў адрозненні ад большасці твораў шматмоўнай паэзіі Вялікага Княства Літоўскага не толькі прамаўляў да розуму сучаснікаў, але і адгукнуўся ў сэрцах нашчадкаў.

Лія Кісялёва ў артыкуле „Балады Яна Чачота: разбурэнне канону” разважае пра балады Яна Чачота, у якіх рэальныя людзі, уключаючы самога аўтара, ператвараюцца ў персанажаў, адпаведна, персанажы мімікруюць пад сапраўдных асоб. Балады Яна Чачота, на думку аўтаркі, вельмі літаратурныя, нават металітаратурныя, гэта значыць засяроджаныя і замкнёныя на ўласнай „літаратурнасці”, на раскрыцці механікі паэтычнай творчасці.

Доктар філалогіі Белдзяржуніверсітэта Людміла Сінькова сваю працу прысвяціла постмадэрнісцкай інтэртэкстуальнасці і яе стасунках з мастацкай традыцыяй у прозе Сяргея Балахонава — 33-гадовага празаіка, які шукае новыя формы для рэалізацыі свайго філалагічна-культуралагічнага інтэлекту.

Цікавым філасофска-літаратурным даследаваннем атрымаўся артыкул Івана Штэйнера „Увасабленне горада ў філасофіі і паэзіі А. Рэмбо, Ф. Ніцшэ і А. Разанава. Іван Штэйнер у сваім матэрыяле падкрэслівае, што горад у Алеся Разанава — унікальнейшае дасягненне чалавецтва, у якім чалавек будуе горад, а горад стварае чалавека. Беларускі паэт Алесь Разанаў сцвердзіў еўрапейскасць нацыянальнай культуры, якая ўжо без усялякіх комплексаў сведчыць аб узлёце і велічы беларускага духу.

Раздзел „Мова” распачынаецца вялікім артыкулам Ніны Баршчэўскай пра погляд беларускай эміграцыі на ролю роднае мовы ў станаўленні нацыянальнай тоеснасці. Сапраўды, тыя ж, напрыклад, беларускія эміграцыйныя выданні заўсёды спрыялі кансалідацыі беларусаў, расцярушаных па цэлым свеце, дапамагалі ім гуртавацца на глебе нацыянальнай ідэі. „Развіццё беларускай мовы ў дыяспары, — як піша Ніна Баршчэўская, — гэта не проста частка гісторыі нацыянальнай мовы, гэта важны сацыялінгвістычны і этнакультурны рэсурс, школа выжывання і самаўсведамлення”.

Міраслаў Янковяк у сваім артыкуле разважае пра беларускую мову ў Латвіі, пра яе статус, сферу ўжывання і перспектывы. Мэта яго выступлення на старонках выдання — гэта паказаць умовы, у якіх існавала і існуе беларуская мова ў Латвіі, пачынаючы з канца XIX стагоддзя і да сённяшніх дзён. Вось некаторыя прыклады. У 1921 годзе міністрам культуры Латвіі выбралі Яніса Райніса — латышскага пісьменніка, які вельмі пазітыўна, па-сяброўску, ставіўся да беларусаў. У гэты час у Латвіі існавалі больш за 40 беларускіх пачатковых школ і чатыры гімназіі. На пачатку Другой сусветнай вайны савецкая ўлада зачыніла на латвійскіх землях беларускія школы. Зноў іх падчас вайны адчынілі немцы. Пасля Другой сусветнай вайны ў Латвіі не існавала ўжо школ нацыянальных меншасцей за выключэннем расійскіх... Вось такая сумная статыстыка.

Вельмі цікава чытаецца артыкул Вольгі Трацяк аб гісторыі перайменаванняў на Беларусі, а яны на Беларусі адбываліся некалькі разоў. Залежала гэта ад гістарычных умоў, у якіх апынулася Беларусь. Найцяжэйшым часам для назваў яе населеных пунктаў быў 1964 год, калі 30 чэрвеня на Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР было прынята рашэнне перайменаваць адразу 318 населеных пунктаў. На змену былым назвам, выпрабаваным гісторыяй, прыйшлі назвы, якія ў большасці выпадкаў не нясуць тапанімічнай нагрузкі. На карце Гродзеншчыны, напрыклад, зніклі назвы вёсак Жалігова, Свінашкі, Пацэнкі, Вулька Жданова, Кабакі, Плехава і г.д. Замест гэтых назваў з’явіліся — Вішнёва, Зорная, Лугавая, Лясная, Снежная, Ягадная і г.д.



Артыкулы Алены Глагоўскай заўсёды чытаюцца з цікавасцю, бо ў іх прысутнічае адкрыццё і навізна. На суд чытачоў у новым выданні наш гісторык і літаратуразнаўца вынесла сваё шыкоўнае даследаванне „Беласточчына ў жыцці і творчасці Хведара Ільяшэвіча”. І хоць паэт нарадзіўся ў Вільні, яго жыццё, творчасць і выдавецкая дзейнасць былі цесна звязаныя з Беласточчынай. Ён быў жанаты з Надзеяй Алексяюк з Тапалянаў, што каля Міхалова. А ў гады Другой сусветнай вайны Хведар Ільяшэвіч узначальваў Беларускае аб’яднанне ў Беластоку, рэдагаваў беластоцкую газету „Новая дарога”. Алена Глагоўская сабрала па крупінцы ўсё, што звязана з Хведарам Ільяшэвічам і Беласточчынай. Атрымалася добрае даследаванне-кніжка ў кніжцы і светлая памяць пра таленавітага беларускага грамадска-культурнага дзеяча, паэта, крытыка, празаіка Хведара Ільяшэвіча.

Нехта А. Гронскі два гады таму ў часопісе „Беларуская думка” апублікаваў артыкул „Кастусь Калиновский: конструирование героя”, дзе аўтар распавёў пра тое, што Кастусь Каліноўскі далёка не беларускі герой, а антыгерой. З гэтым катэгарычна не пагадзіліся і не пагаджаюцца многія беларускія гісторыкі, навукоўцы і літаратары, у тым ліку і гісторык Ігар Запрудскі, які ў сёлетнім выданні „Acta Albaruthenica” на архіўных дакументах, старых выданнях і публікацыях даказвае, што Кастусь Каліноўскі быў і застаецца беларускім нацыянальным героем.

Спіс цікавых даследчых артыкулаў, якія склалі дзесяты том „Acta Albaruthenica”, можна працягваць. Прыцягваюць увагу чытачоў і артыкулы Адама Мальдзіса „Дык колькі гадоў беларусам? Роздум пасля тысячагоддзя Літвы”, Генадзя Нікалаева „Музей Янкі Купалы пад Казанню”, Ганны Кісліцынай „Чалавек як праблема літаратуразнаўства”, Тэрэзы Занеўскай пра паэзію Рыгора Крушыны і дзесяткі іншых.

1 ☞ працяг

Князь з Бандароў

свечаны свайму прафесару Андрэй Сцепанюк, зараз дырэктар Бельскага белліцэя.

— Прафесар Баршчэўскі даў мне адчуць свабоду ў студэнцкія часы, — тлумачыць і заадно размалёўвае тагачаснае ўяўленне свабоды: чалавека з кніжкай, які папівае малако.

У расказах спадара Баршчэўскага пашчырасці больш лілося паэтычнай гарэлкі чым малака, але пры гэтай гарэлцы сядзелі перш за ўсё людзі. За стол садзіліся найчасцей блізкія асобы, размова з якімі заўсёды ўзбагачала чалавека, як падкрэсліваў юбіляр. У час юбілею спадар Баршчэўскі з жонкай Нінай ды вядучая вечарыну гісторык Лена Глагоўская таксама сядзелі за сталом, амаль як у роднай хаце. За плячыма мяняліся не толькі здымкі прафесара з розных гадоў, але перш за ўсё родныя краявіды. Акружалі яны і ўсіх гасцей на карцінах намаляваных Марыяй Саковіч-Крашэўскай.

— Каб зразумець паэта — цытавала Гётэ прафесар Занеўская, — трэба пазнаць яго месца паходжання.

Якраз у час юбілейнай сустрэчы ўсе госці стараліся даказаць, што з гэтага боку свайго майстра ведаюць выдатна. Большасць, ці гэта вучні, ці студэнты, ці сябры літаб’яднанняў, так польскага, як і беларускага, спасылаліся на радкі вершаў героя. Так блізкіх, як і далёкіх, ядроных слоў нібыта калоссе, жнівеньскіх палёў ды матчыных куткоў. Кожны аспект жыцця і тугі паэта здаецца быў закрануты. Адчувалася радасць ад сустрэчы і спакой успамінаў, хаця сам паэт у час свайго выступлення, калі абдзіраў з павагі настрой спаткання, не забыў адзначыць, што „спакой паэта — вечная трывожнасць”. Адагнаць трывогу ў час сустрэчы стараліся ўсе, у тым ліку землякі з Міхалоўскай гміны, якія абдорылі паэта боханам духмянага хлеба.

Пакуль прафесар Баршчэўскі супольна з жонкай адрэзалі першы кавалак юбілейнага торта, пакуль для гісторыі зняліся ўсе госці мерапрыемства, „князь з Бандароў” узяў голас яшчэ раз:

— Моладзь гэта будучыня беларусаў! — амаль выгукнуў са сцэны пасля атрымання ад маладых, прыгожых алімпіек карціны з бандарскімі пейзажамі.

А на канец былі пажаданні, пад якімі падпісаліся лаўрэаты Агульнапольскай алімпіяды беларускай мовы, а пад якімі з прыемнасцю падпісаліся б, думаю, усе мы.

ЧАС АКУПАЦЫІ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Расказ Марыі Вязоўскай, народжанай у Зубаве ў 1935 годзе.

Мае мама і тата пажаніліся ў 1933 годзе; мама прыйшла жыць з татавай сям'ёй. Разам з маімі бацькамі жылі яшчэ татавы бацькі Кузьма і Марыя ды татавы сёстры Вера з 1913 года і Акуліна з 1924 года. Акуліна ў 1942 годзе выйшла замуж за аднавяскоўца Міхала Дмітрука і перабралася да яго, а Вера замуж не выходзіла, жыла з намі да 1953 года, калі стала на працу ў Беласток і перасялілася туды.

У Першую сусветную вайну ўся татава сям'я выехала ў бежанства. Жылі яны ў горадзе Новачаркаску, недалёка Растова-на-Доне. Тату тады дзевяць або дзесяць гадоў было, калі хадзіў ён на чыгуначную станцыю, дзе па пуцях іконы валяліся. Тата адну ікону дадому прывёз, яна зараз у цёткі Акуліны.

У маёй бабулі па маме было дзевяцёра дзяцей; жывых асталося трое. Большасць з іх нарадзілася ў бежанстве і там яны паўміралі ад тыфу. Памёр там і мамін тата. Бабуля калісь расказвала, што пасля вяртання з бежанства сям'я наша была ў вялікай дружбе з адной сям'ёй з Малешаў; малешаўцы нам памагалі, нават пасля двое парасят далі нам.

У Зубаве жылі мы ў малой драўлянай хаце, якая складалася толькі з аднаго памяшкання. Была гэта вельмі старая хата, на адной са сцен яе быў выдзерты гвоздзем год яе пабудовы — 1800. Гэтую хату мае дзяды купілі ў Пілiпках. Каля дзвярэй у сенцы была — закрытая ўжо ў мой час дошкай — палічка, вымашчаная глінай, на якой калісь клалі лучыну і палілі, каб у цёмную пару сутак відна было. За адной са сцен быў хлеў і за сенцамі, якія былі за супрацьлеглай сцяной, таксама быў хлеў — так было зімою цяплей. Такіх хат, паміж хлявамі, было ў Зубаве больш.

У куце хаты, прылягаючым да сенцаў, стаяла хлебная печ з зевамі, у якіх пяклі хлеб. Была яна ўся ўбітая з гліны, не з цэглы. Пліты ў нашай хаце не было, быў толькі прыпечак. Зімою на пячы спала я з бацькамі. Паміж печчу і сцяной, што аддзяляла хату ад хлява, быў запек, на якім спалі баба з дзедам; з запека выходзіла адно акно. У супрацьлеглай да запека сцяне было двое акон, пад якімі, на ўсю сцяну — ад хлява да сенцаў — стаяла лава. І пад сцяной, што аддзяляла хату ад хлява, таксама стаяла лава, на якой ноччу спала цётка. Перад гэтымі лавамі, паблізу супрацьлеглага да печы кута хаты, стаяў прамавугольны стол, перад якім стаяў яшчэ зэдлік. Летам спалі мы на сене.

Падлога ў нашай хаце была — так як і печ — убітая з гліны. Пад Руздво змазвалі той ток сумессю каровіных адходаў з глінкай і засцілалі саломай на некалькі дзён. Пасля гэтага часу салому забіралі, падлогу замяталі і яна гладкай была.

Яшчэ да 1960 года ўсе ў Зубаве палілі торфам. Тарфовішчы былі кіламетр-паўтара за вёскай. Кожны гаспадар меў свой тарфяны ўчастак. Капалі торф спецыяльнай рыдлёўкай з разной пласцінай з двух крылаў пастаўленых да сябе прамавугольна. Торф быў пад дзярном, быў ён мяккі, згаданай рыдлёўкай выразалі з яго прамавугольныя брускі памерам каля 12х12х23 сантыметры. Капалі роў у тры-чатыры штыхі, усё было ў вадзе. Капалі ў чэрвені, да жніўня-верасня ён высыхаў.

У дзяцінстве дзяўчаты гулялі лялькамі. Мне лялькі мама шыла. Усё мама шыла, рукамі, бо швейнай машыны ў нас не было. І мячыкі мама шыла мне са шмат. Калі тата, які ў 1940 годзе паехаў на работу ў Расію, прыслаў мне адтуль гумавы мячык, то я вельмі ганарылася ім.

У школу, у Зубаве, стала я хадзіць пры саветах. Настаўнік, Герасім Вязоўскі, быў з Зубава, вучыў ён нас па-руску. Пасля яго, у другім класе, вучыла нас Ольга Пракапюк, але яна навучыла мала: пісала лацінскімі літарамі і гаварыла, што гэта па-нямецку. Бывала, што чытала яна нам казкі, то гулялі мы, то спявалі. Калі ў 1944 годзе прыйшоў вучыць Нестар Перавой, родам з Кнаразоў, і пабачыў, што мы мала ўмеем, то паўгода прысвяціў вывучэнню намі матэрыялу другога класа, а другую палову года вучыў нас па праграме трэцяга класа. Быў ён чалавекам ціхім, і таму, напрыклад, не вучыў нас спеву; гэтаму прадмету вучыла нас ягоная дачка. Ён быў вельмі добрым настаўнікам — вырас ён у царскі час і вельмі стараўся нас навучыць; у Зубаве працаваў ён чатырнаццаць гадоў. Мяне ён вучыў з трэцяга па пяты клас. Калі я была ў пятым класе, вучыў у нашай школе яшчэ адзін настаўнік, Асіпюк з Бельска, аднак ён быў у нашай школе толькі адзін год, а пасля школа ў нашай вёсцы стала толькі чатырохкласнай, у якой толькі Перавой астаўся вучыць.

Перавой купіў сабе ў Зубаве старую хату, адрамантаваў яе: абабіў звонку драначкамі і яна стала як мураванка. Жыў ён там з жонкай, было ў іх дзве дачкі — Зіна і Валя. Усведамляў ён нашых вяскоўцаў, што мужчыны павінны памагаць жанчынам у хаце, бо хатняя работа вельмі цяжкая.

Пасля пятага класа я нідзе не вучылася; у той час ніхто нідзе не вучыўся. У 1948/1949 навучальным годзе я вучылася ў шостым класе ў школе ў Катлах; жыла я там у мамінай цёткі — дзедавай сястры. А іншыя дзеці з нашай вёскі хадзілі ў школу ў Пасынках. А я тады хілая была і мяне бацькі пашкадавалі, каб я столькі, так далёка, хадзіла. Сёмы клас я прайшла ў Бельску, там мне бацькі наймалі кватэру. Чарговыя чатыры гады я правучылася ў Бельскім педагагічным ліцэі. І пасля ліцэя атрымала я працоўны наказ у школу ў Кожына і тры гады трэба было вучыць.

Калі насталі ў нас саветы, сталі тады агітатары хадзіць і намаўляць на працу ў Расіі, на Урал, у шахты. З Зубава запісалася пецярых ахвотных: мой тата Ян Іванюк, Стэфан Бядрыцкі, Адрыян Карпюк, Ксенафонт Нестарук і Ян Назарук. Першыя чатырох мелі па больш-менш трыццаць гадоў, Назаруку было семнаццаць, але паехаў абы з хаты, бо тут цяжка было. Выехалі зімою 1940 года ў горад Златавуст каля Чалябінска. Працавалі там на будоўлях над руднымі шахтамі. Работа няцяжкая была, але заробкаў хапала толькі на ежу.

Калі закончыўся кантракт, то іх дадому не пусцілі, толькі загадалі аставацца на рабоце. Нестарук не пайшоў на працу, то яго арыштавалі і забралі ў турму; прапаў ён без весткі. Назарука забралі ў армію і ён на вайну трапіў. А тата, Бядрыцкі і Карпюк рашылі ўцякаць дахаты. Падарожжа было цяжкае, бо трэба было ўвесь час хавацца; нават іх затрымлівалі, але неяк выкручваліся. Ішлі пяшком, пад'язджалі грузавікамі і таварнымі паяздамі, увесь час тайком. У Зубава вярнуліся ў маі 1941 года.

Вайна завітала да нас у 1941 годзе. Людзі з нашай вёскі выязджалі ва ўрочышча Дэрэвіна. Наша сям'я прасядзела там пад возам усю ноч. Але стрэлаў не было. Насталі немцы.

Немец усё абмяжоўваў. Трэба было здаваць малако і збожжа. Маслабойкі трэба было аддаць у пункт прыёму малака. І жорнаў нельга было мець. Нашы сямейнікі завезлі свае жорны ў клуню і там іх снапамі абклалі. Калі малолі, то нехта адзін малоў, а іншы выглядаў навонкі ці немцы або суседзі не бачаць. І свіней нельга было біць. Пайшла была чутка, што ў Саках свіней спісваюць. У нас вялікі паршук быў. Закалолі яго ноччу і завезлі на пашу пад Кожына, пад павець, у якой трымалі ў спёку кароў, каб іх тады авадні не джалілі. Там паршука асмалілі і разабралі. Аднак мяса не ўдалося адразу прывезці; прывезлі яго, здаецца, у другую ноч. Жоўць тады разлілася і ўсё мяса было горкае.

Забаранялі гнаць самагонку. У суседа рошчыну знайшлі і ён сказаў, што яна татава. На другі ці трэці дзень прыехалі да нас жандары. Баба загадала мне голасна плакаць. А тата кажух адзеў, каб менш балела, калі будуць біць. Але ўсё абышлося.

Была і станоўчая падзея, у пачатку акупацыі — зачыстка ад

працяг ☞10



Здымак з сямейнага архіва Марыі Вязоўскай

Цімафей Вязоўскі, дзед Марыі Вязоўскай па маме

Здымак з сямейнага архіва Марыі Вязоўскай

Ян Іванюк, бацька аўтаркі ўспамінаў, на Урале

9 ☞працяг

Час акупацыі і калектывізацыі

тараканаў; відаць, ведалі немцы, якая ў нас гігіена. Спярша выселілі адну полаць, што з аднаго боку вуліцы, на другі бок, на ноч ці дзве. І ў выселеных хатах чагось на падлогу насыпалі, абсыпалі гэта пяском і запальвалі, і чыста было ад плюгаўства. А некалькі дзён пазней дэзінфіцыравалі такім жа чынам другую полаць вуліцы.

Пасля вайны сталі ў Зубаве арганізаваць калгас; першыя сходы адбыліся ў маі 1949 года. Усё агітавалі, каб у калгас пісацца, не давалі жыць. 13 кастрычніка 1950 года наш вясковы сход прыняў пастанову пра арганізацыю вытворчага кааператыва; усе малазямельныя запісаліся адразу, а ўсіх запісалася каля сарака гаспадароў. Неўзабаве, 21 красавіка 1950 года, правялі ў Зубава электрычнасць. Мой тата ў калгас не пісаўся, бо бачыў што рабілася на Урале, і выехаў на працу ў Беласток. І як сталі тут арганізаваць калгас, то ўся моладзь з Зубава стала розных школ шукаць у гарадах. З нашай вёскі выйшла каля трыццаці настаўнікаў (у іх ліку м.інш. дырэктар Бельскага белліцэя Аляксей Карпюк), шмат лекараў, медсясцёр, вайскоўцаў, міліцыянтаў, ветэрынараў, меліяратараў, трактарыстаў...

У другой палове 1940-х і ў першай палове 1950-х гадоў сталі ў Зубаве ўспыхваць пажары. Дзіўныя гэта былі пажары, бо ў 1949 годзе бяспека дапытвала пагарэльцаў, чаму яны падпальвалі, хаця падпальнікі былі іншыя. Усяго было тады каля дваццаці пажараў у Зубаве. Людзі ведалі хто паліў, але не гаварылі, бо за руку нікога не злапалі... Першую сям'ю, што пацярпела ад пажару, на тры месяцы забралі ў турму. У турму на два ці тры тыдні трапіла і мая мама, але за падаткі, бо не мела з чаго плаціць. Тата ў Беластоку быў, сястрычцы пяць гадоў было, я ў школе тады вучылася... Войтам у Пасынках быў тады мамін дваюрадны брат і гэта ён яе пасадзіў...

І нашу сям'ю не мінулі пажары. 9 мая 1954 года, акурат перад маёй матурай, згарэла ў нас усё, у тым ліку і 154-гадовая наша хата з 1800 года. Акурат у той час мацаваліся калгасы, быццам ужо назаўсёды, а таты ўсё яшчэ ў калгасе не было. Прызналі нам дзевяць тысяч злотаў страховачнай кампенсацыі, а хату для куплі знайшлі за чатырнаццаць тысяч. Тату прызналі дзве тысячы пазыкі, але аднялі і далі некаму іншаму. Я стала на працу і ўсе грошы дадому аддавала. У купленай у Моры хаце перазімавалі мы толькі адну зіму і зноў пажар... У нас то яшчэ дабытак астаўся, а ў некаторых людзей пагарэла ўсё, такое бедства было... Пасля другога пажару тата вярнуўся ў Зубава, стаў гаспадарыць, дзед выдзеліў яму частку поля і дабытку. Бо да гэтага часу ўсе грошы дзед трымаў, а цяпер стаў іх трымаць тата. І я яму ўсе свае зароблены грошы мусіла аддаваць, бо ж трэба было адбудоўвацца. Калі купіла сабе хустку, то хавалася, каб тата не бачыў і не крычаў.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Здымак з сямейнага архіва Марыі Вязоўскай

Зубаўскі самадзейны калектыў у 1950-х гадах

http://rehaby.info.

Любоў да роднага краю, пэўна, тычыцца любові да ўсяго, што звязана з роднымі мясцінамі. Патрыётаў вабяць не толькі разнастайныя гістарычныя падзеі, якія датычныя іх гарадоў ці вёсак, але і сучасны стан усяго, што звязана з малой радзімай — літаратура, артыкулы, даследаванні, фотаздымкі і гэтак далей. Зразумела, здабываць гэтую інфармацыю выключна для сябе не мае аніякага сэнсу. З таго і паўстаюць такія маланакладныя газеты кшталту „Рэха Берасцейшчыны".

Праўда, аб існаванні данай газеты цэлы свет наўрад ці здолеў бы даведацца, калі б не ўзнік у інтэрнэце сайт з аднайменнай назвай, які месціцца па адрасе **http://rehaby.info.** «Ідэя стварэння краязнаўчага сайту „Рэха Берасцейшчыны" з'явілася пасля выхаду трэцяга нумару аднайменнага бюлетэню. Разумеючы, што папяровы бюлетэнь „Рэха Берасцейшчыны" не можа змясціць шырокі спектр краязнаўчай інфармацыі краю, і з-за абмежаванасці свайго накладу не можа быць даступны многім патэнцыйным чытачам, паўстала жаданне стварыць яго электронную версію, — распавядаюць пра гісторыю ўзнікнення сайта яго ўладальнікі на старонцы „Кантакт". — Сайт „Рэха Берасцейшчыны" з'яўляецца вынікам працы краязнаўцаў, гісторыкаў, аматараў турызму і іншых зацікаўленых асобаў краю. Любы жадаючы можа прапанаваць нам свае артыкулы, матэрыялы, фотаздымкі для сайту, або выказаць свае ідэі, заўвагі ці прапановы».

Што ж тычыцца агульнага ўражання ад сайта, то варта адзначыць, што ён зроблены дастаткова прафесійна, навігацыя па ім простая, даступная кожнаму не вельмі прасунутаму карыстальніку. Нягледзячы, што ў выяўленні галоўнай старонкі пераважае шэры колер, не ствараецца ўражанне нейкай бляклaсці сайта. Магчыма, гэта з-за таго, што да кожнага анонса, размешчанага там, дадаецца невялікі фотаздымак.

Рубрык на сайце дастаткова, каб ахапіць галоўныя напрамкі краязнаўства. Так, на старонцы „Артыкулы" цікаўнаму карыстальніку прапаноўваюцца тэксты па гісторыі, рэлігіі, культуры Берасцейскага краю, распавядаецца пра некаторых слынных асоб, што мелі дачыненне да тых мясцін. На жаль, падрубрыка „Этнаграфія", якая месціцца там жа, пакуль не мае аніводнага артыкула. Значыць, уладальнікам сайта ёсць яшчэ над чым працаваць.

На рубрыку „Бібліятэка" таксама, відаць, чакае больш насычанае будучае. Пакуль там няма ані кніг, ані часопісаў. З усёй літаратуры — толькі чатыры нумары аднайменнай з сайтам газеты ў фармаце pdf. Дарэчы, адсюль можна даведацца, што і ўласна газета мае яшчэ невялікі ўзрост — першыя два яе нумары выйшлі ў снежні 2008 года, два апошнія — сёлета ўвосень. Праўда, чамусьці ўладальнікі сайта двойчы размясцілі першы сёлетні нумар у абедзвюх спасылках на газеты гэтага года.

Даволі арыгінальнай старонкай падаецца „Энцыклапедыя". Без ваганняў можна сцвярджаць, што яе ідэя была ўзятая з сайтаў разнастайных слоўнікаў ці даведнікаў. У алфавітным парадку размешчаныя нейкія апорныя словы, што выводзяць на адпаведны тэкст. Праўда, далей за літару „Л" справа пакуль не прасунулася.

Нямнога інфармацыі, прычым толькі аб Івацэвіцкім раёне Берасцейшчыны, мы знойдзем у рубрыцы „Турызм".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Без аптымізму

Шмат гаворыцца астатнім часам пра адраджэнне беларускага гандбола, аднак падзеі апошніх месяцаў зусім не даюць нагоды для аптымізму. Месяц таму мы расказвалі пра няўдачы мужчынскай зборнай у кваліфікацыі да чэмпіянату Еўропы, а зараз у снежні сумную „эстафету" падхапіла і жаночая дружына.

У партугальскім горадзе Фуншал на востраве Мадэйра дзяўчатам са зборнай Беларусі належала пазмагацца за адзіную пуцёўку ў накаўт-раўнд да фінальнай часткі першынства свету, якое праз год пройдзе ў Бразіліі. Сапернікамі на гэтай стадыі сталі каманды Партугаліі, Турцыі і Фінляндыі. Здавалася б, нічога страшнага на спаборным шляху. Але ж гэты бар'ер узяць так і не ўдалося. Між іншым адборавы турнір быў першым афіцыйным выпрабаваннем зборнай пад кіраўніцтвам расійскага спецыяліста Анатоля Закладнога і яго асістэнта Валерыя Пяўніцкага, які вярнуўся да родных парогаў пасля некалькіх гадоў легіянерскай кар'еры. Новы штаб, атрымаўшы спадчыну ад ранейшага настаўніка Канстанціна Шаравара, пастараўся сабраць усіх мацнейшых айчынных гандбалістак, аднак патрэбная мазаіка не склалася.

У першым паядынку беларускі без асаблівых праблем далі рады гаспадыням пляцоўкі. Запалу і сіл тых хапіла толькі на першы тайм, у другой палове славянкі спуртавалі і ўпэўнена перамаглі — 28:22. Дзівіцца тут не было асабліва чаму — партугальскі гандбол робіць першыя поспехі пакуль толькі на дзіцяча-юнацкім роўні. Дадам, што лепшай у складзе Беларусі стала паўсярэдняя з „Гараднічанкі" Валянціна Янкоўская, на рахунку якой 7 галоў. А яшчэ вікторыя была азмрочана траўмай асноўнай дасведчанай распасоўшчыцы Алесі Курчанковай. Другая сустрэча — з прадстаўніцамі краіны Суомі — склалася куды цяжэй, хоць сапернік і лічыўся аўтсайдарам. У выніку беларускі святкавалі сціплы поспех — 23:21. Найбольш мячоў — па 5 закінулі Янкоўская і Ірына Дронава.

З Турцыяй Беларусь на роўні жаночых зборных сустракалася да гэтага 10 разоў і, нягледзячы на агульны парытэт у статыстыцы, у афіцыйных матчах пераважна брала верх. На гэты раз не атрымалася — параза 31:33. Параза невыпадковая, а хутчэй заканамерная. Не дапамог і гераізм Курчанковай, якая ўсё ж выйшла на паркет і ажно 10 разоў прабівала галкіпераў саперніц. Такім чынам Беларусь заняла ў кваліфікацыйным квартэце толькі другое месца і выбыла з розыгрышу. Канешне, можна наракаць на кадравыя праблемы — траўмы пакінулі за бортам адборавага турніру вопытных Лілію Арцюховіч і Ірыну Арцёменку. Але ў спорце такое здараецца спрэс і ўсюды. Хутчэй усяго гэтая няўдача — аб'ектыўна наша месца ў гандбольнай іерархіі.

Даўно не радавалі сваіх прыхільнікаў і гандбалісты мінскага „Дынама" ў Лізе чэмпіёнаў. Прабіўшыся туды ўпершыню, бела-блакітныя ў 6 сустрэчах здолелі выйграць толькі раз. У апошнім матчы падначаленыя Сяргея Бябешкі пацярпелі паразу на выездзе ад венгерскага „Піка" з горада Сегед — 34:37. „Дынама" трывала асела на дне табліцы групы „С". Вось як выглядае становішча ў гэтым секстэце: 1) „Чэхаўскія мядзведзі" (Расія) — 11 ачкоў; 2) „Вальядалід" (Іспанія) — 10; 3) „Пік" — 8; 4) „Шафгаўзен" (Швейцарыя) — 5; 5) „Ольбарг" (Данія) — 4; 6) „Дынама" — 2. Праўда, у „Дынама" гульня са швейцарцамі ў запасе, але гэта ніяк не падвышае яго турнірныя перспектывы. Зараз у турніры наступіў перапынак ажно да лютага.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гайнаўская апякунска-аздараўляльная ўстанова

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Кіраўнік ЗПО Галіна Вісьнеўская

Апякунска-аздараўляльная ўстанова ЗПО (ZPO — Zakład Pielęgnacyjno-Opiekuńczy) у Гайнаўцы, што знаходзіцца ў структуры мясцовага шпіталя, з'яўляецца стацыянарнай установай, якая даглядае тых пацыентаў, якім непатрэбная далейшая шпіталізацыя, але з-за стану здароўя патрабуюць яны пастаяннага лекарскага дагляду, прафесійнай апекі і рэабілітацыі.

— Пабыўка ў нашай установе, — кажа кіраўнік ЗПО Галіна Вісьнеўская, — мае характар часовы і працягваецца шэсць месяцаў. Нашым пацыентам, рознага ўзросту і з рознай ступенню абмежавання здольнасці руху, аказваем прафесійныя паслугі медсясцёр і рэабілітантаў. Наш персанал вучыць пацыента самастойнасці, рыхтуе да самаапекі, дапамагае ў прыстасаванні да цалкам зменанай у выніку хваробы сітуацыі. Нашу прапанову кіруем да тых пацыентаў, у якіх закончаны працэс інтэсіўнага шпітальнага лячэння, але неабходны прафесійны медыцынскі дагляд і рэабілітацыя.

Кіраўнік ЗПО Галіна Вісьнеўская па прафесіі медсястра, выпускніца Медыцынскага ліцэя ў Бельску-Падляшскім і абітурыентка Універсітэта ў Беластоку. Працуе яна ўжо 31 год, а з 1 сакавіка 1999 г. узначальнае ЗПО ў Гайнаўцы. Любіць прымаць выклікі. Калі пад канец дзевяностых гадоў былі тэндэнцыі скарачаць штат медсясцёр, яна без вагання прыняла прапанову стварыць установу па даглядзе і рэабілітацыі пацыентаў. Было цяжка, але ніхто не абяцаў, што будзе лёгка. Аднак пераадольвала яна шматлікія перашкоды і як цунамі ішла наперад, з галавой акунулася ў працу. Апякунска-аздараўляльная ўстанова пад яе кірункам стала лідарам у ваяводстве. Ва ўсёй Польшчы такіх устаноў было таксама няшмат, паколькі доўгатэрміновая стацыянарная апека на просьбу пацыента або яго сям'і толькі пачынала развівацца.

Першапачаткова ЗПО ў Гайнаўцы распараджалася 17 ложкамі, аднак вельмі хутка аказалася, што запатрабаванне на такія паслугія расце з дня на дзень. Цяпер установа можа прыняць 41 асобу. Персанал ЗПО налічвае 34 асобы — гэта медсёстры, санітаркі, лекары, рэабілітанты і іншыя спецыялісты.

Пачаткова апякунска-аздараўляльная ўстанова знаходзілася ў галоўным будынку шпіталя па вуліцы Ліпавай 190, на другім паверсе. Кватэрныя ўмовы і абсталяванне былі вельмі сціплыя. З часам, дзякуючы Дзяржаўнаму фонду рэабілітацыі інвалідаў і шматлікім спонсарам, прыбыло спецыялістычнага абсталявання, якое аблягчала працу персаналу і стварала лепшы камфорт пацыентам. 15 кастрычніка 2009 г. ЗПО перасяліўся ў адрамантаваны будынак па вуліцы 11 Лістапала 20. Праца ў новым месцы мае як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Плюсам з'яўляецца тое, што гэта аднапавярховы будынак і пацыентам лягчэй выходзіць або выязджаць на калясках на прагулкі. Аднак знаходжанне па-за шпіталем гэта брак доступу да амбулаторый, кухні, аптэкі, лабараторыі і адміністрацыі. Дзякуючы добраму супрацоўніцтву з транспартам усе клопаты зведзены да мінімуму. Харчаванне давозяць у тэрмасах на час. Няма тут капліцы, таму набажэнствы адбываюцца ў святліцы.

— Наш персанал стараецца, каб аднаўленне здароўя адбывалася ў мілай і сардэчнай атмасферы, — кажа Галіна Вісьнеўская. — Стараемся, каб пацыент адчуваў сябе як дома. З нагоды каляд арганізуем святочныя спатканні, а „Карытас" абдароўвае пацыентаў падарункамі.

Хаця апякунска-аздараўляльная ўстанова працуе ў новым месцы больш года, не ўсе справы даведзены да канца. Напрыклад, брак адпаведнай агароджы, роўных тратуараў, выгадных пад'ездаў, агародчыка для адпачынку. Трэба таксама аднавіць фасад будынка. Гэтыя клопаты не даюць спакою кіраўніку ЗПО Галіне Вісьнеўскай, якая перакананая, што дзякуючы цярплівасці і беззаганнаму супрацоўніцтву з дырэкцыяй шпіталя і стараствам праблемы будуць вырашаны.

Размаўляў я з пацыентамі, якія па розных прычынах апынуліся тут. Усе вельмі цёпла выказваліся аб працы сваіх апекуноў. Жыццё ў спакоі, чысціні і ў сардэчнай атмасферы прыносіць палёгку спакутаваным хваробай пажылым людзям. Заглянуў я на старонкі кніжкі падзяк. Чытаючы запіскі з амаль усяе Беласточчыны і з-па-за Падляшскага ваяводства я ўзрушыўся да слёз іх зместам. З гэтага таксама відаць, што персанал ЗПО пад кіраўніцтвам Галіны Вісьнеўскай стварае адпаведныя ўмовы знясіленым хваробай пацыентам.

19.12 — 25.12

(22.03. — 20.04.) Паправіш памылкі і выйдзеш на простую дарогу, можаш думаць выключна пра святкаванне. Хопіць табе сілы і нават адчаю. Твае рашэнні будуць хуткія і трапныя (пераканаешся аб гэтым на пачатку 2011 г.). На працы мілыя адносіны шэфа. 21.12. могуць табе „пусціць" нервы.

(21.04. — 21.05.) Да 20.12. могуць ускладніцца адносіны з шэфам. 21.12. можаш мець праблемы з засяроджаннем (зацьменне Месяца), адтэрмінуй цяжкія справы. Можа заспець цябе неспадзяваная прапанова. Можаш закахацца ў Скарпіёна (нават не з першага пагляду, а... слыху ці ліста!).

(22.05. — 22.06.) 19-23.12. пільнуйся неабдуманых рашэнняў, не рабі нічога наперакор, нават для жарту. Можаш паправіць адносіны з людзьмі і абмеркаваць спрэчныя пытанні. Буры ў шклянцы ў хаце. На Сільвестра не думай сядзець дома; запланаваў выхад ужо цяпер, бо можа гэта быць пераломны дзень у тваім жыцці.

(23.06. — 23.07.) Добры настрой, усё зашпіліш на апошні гузік. 21.12., пры зацьменні Месяца, можа прытрапіцца шмат непрыемных сітуацый; турбаваць цябе будзе пачуццё віны. Не кідай справы, калі не ўдасца за першым разам. Вельмі прыемныя хвіліны для святкуючых.

(24.07. — 23.08.) 20-24.12. будзеш незвычайна крэатыўным. Твае ідэі выклічуць захапленне. Хоць у першыя дні тыдня можа цябе штосьці моцна турбаваць, штосьці цябе заспее і можаш замоцна адрэагаваць. На працы крыху сонная атмасфера; некаторыя справы завершыш пад канец года.

(24.08. — 23.09.) 19-23.12. — ідэальны час на рэалізацыю мараў. Можаш здабыць тое, чаго хочаш, дзякуючы карысным выпадкам. Лёгка адновіш свае сілы. 20-24.12. хтосьці з найбліжэйшых можа цябе моцна ўзлаваць.

(24.09. — 23.10.) Кожную справу давядзеш да фіналу. Задбаеш аб сваіх блізкіх. Знойдзеш час на размову. Выдаткі расплануеш так, што хопіць на ўсё, не мусіш лічыць кожны грашак. У парах пагодлівае неба. У Шаляў неспараваных час несур'ёзных фліртаў. Не стамляйся і пазбягай стрэсу, а калі зловіш інфекцыю, адразу кладзіся ў ложак.

(24.10. — 22.11.) Час правядзеш міла і з нікім не паспрачаешся. Будзеш усіх уражваць і захапляць. У пары, калі дасі партнёру больш свабоды, зробіш з ім што хочаш (можаш выбрацца ў далёкае падарожжа). Скарпіёны шукаючыя сваёй палавінкі будуць выбіраць не абы-каго. Будзеш адораны пранікліваcцю і інтуіцыяй; аформіш найцяжэйшыя справы. 21.12. вельмі непрыемны дзень, багаты ў злаславасці і прыкрыя сітуацыі (няладныя здарэнні таксама 25-29.12.). Не хваліся грашыма.

(23.11. — 22.12.) Цудоўны настрой, смачная ежа, глыбокія духоўныя перажыванні. З 19.12. бярыся за найцяжэйшыя справы; будзеш спрытны і дасягнеш усяго, чаго хочаш. 20-24.12. схочацца ўзяцца за зашмат спраў адразу. Стральцы народжаныя пасля 18.12. — цікуе за вамі хтосьці вельмі несумленны!

(23.12. — 20.01.) Пазбудзешся турбот, набярэшся сілы і самаўпэўненасці. Будзеш інтэлігентны, лёгка наладзіш кантакты. З 21.12. захопіш іншых фантазіяй, адвагай і празорлівасцю. Рыхтуйся да фантастычнага Сільвестра! Ды 21.12. атмасферу на працы можа папсаваць пляткар, які перамые ўсе твае костачкі.

(21.01. — 19.02.) Будзеш мець ахвоту ўцячы на канец свету, ды наўрад ці табе гэта ўдасца. Правядзі час на размовах, дайся вывалачыся з хаты сябрам. Давер асобе, якая дасць табе нетыповую прапанову. Да 20.12. не ўпірайся лішне на сваім! 19-23.12. не шастай ацэнкамі, каб кагосьці не параніць.

(20.02. — 21.03.) Не чакай новага года, спытайся пра павышэнне — належыцца табе! Дома сапраўднае паяднанне. За сталом толькі частуйся! Аднойдзецца ў табе схаваны талент. 21.12. хтосьці можа цябе няслушна скрытыкаваць

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

1. дакумент патрэбны для праезду польска-беларускай мяжы = 7 _ 8 _ 6 _ 5 _;
2. Томас, англійскі паэт (Gray, 1716-71) = 14 _ 16 _ 17 _ 22 _;
3. вытворца павуціння = 20 _ 21 _ 33 _ 37 _ 1 _;
4. палярная лісіца з каштоўным футрам (*Alopex lagopus*) = 28 _ 13 _ 23 _ 34 _ 12 _;
5. нявольнік = 4 _ 2 _ 3 _;
6. моцнае захапленне = 26 _ 35 _ 36 _ 19 _ 11 _ 9 _ 10 _;
7. лельчыцкая рака = 27 _ 18 _ 30 _ 29 _ 31 _ 32 _;
8. адзначае імяніны 7 верасня = 24 _ 25 _ 15 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 46 нумара

Бюро, Відзы, войт, два, дзень, дзіра, дына, ляда, павеў, роў, рыба, селянін, Сібір, Сыс, сяўба, туз, хмара, хоры, храм, Цітоў, шах, яр, Яўза.

Рашэнне: **Ўсе шляхі прыводзяць не да Рыма, а да родных вербаў і бяроз; любая ў барах сівых радзіма, сын твой нарадзіўся тут і ўзрос.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Дэбют у родным слове — трынаццаты конкурс

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

На ўрачыстае ўручэнне вылучэнняў у XIII Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы „Дэбют", арганізаваным Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва" і Беларускім саюзам, пры падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, у заснежаную суботу 11 снежня не ўсе ўдзельнікі змаглі прыбыць. А дарога была і далёкай — ад Познаньшчыны да вёсак на Беласточчыне, з якіх ва ўік-энды аўтобусам не дабярэшся, тым больш у новую атаку зімы. А былі і аўтары, якім за 80 гадоў (Анатоль Маўчун) і ў дзесяць разоў менш — васьмігадовая Вікторыя Патонец. Наймалодшую дэбютантку з Ляўкова Старога прывезла на машыне яе мама, прабіваючыся праз гурбы снегу.

Камісія ў міжнародным складзе — Надзея Артымовіч з Бельска-Падляшскага, Ежы Плютовіч з Беластока і Янка Трацяк з Гродна ацаніла 19 падборак літаратурных тэкстаў у дзвюх узроставых катэгорыях. У першай групе (вучні пачатковых школ і гімназісты) камплектаў твораў было тры — адной вучаніцы-дэбютанткі з ПШ у Нараўцы Вікторыі Патонец („Ляўкоўка"), дзвюх гімназістак — з Гайнаўкі Магдаліны Панасюк („Непрысутная") і з Беластока — Ганны Валяшчук („Мармур"). Камісія не вылучыла аўтараў у гэтай групе, хоць спадабаліся творы „Яблынька" Вікторыі і „Месяцы" Ганны. У другой групе — ліцэістаў і дарослых вылучаны аўтары ў дзвюх катэгорыях — паэзіі і прозы. Другое месца атрымала падборка беластачаніна Юрыя Нахілы („Круглянскі" — родам ён з вёскі Круглае на Дамброўшчыне) — „Вершы з галавы", з якіх асабліва адзначаны два вершы „Я не быў сынам дрывасека" і „Калі я паехаў бы ў падарожжа", а на месца трэцяе камісія ацаніла падборку трох вершаў дэбютанта ў пісанні на беларускай мове Багдана Дудко („Данчыка") з Цісоўкі Міхалоўскай гміны, асабліва вылучаючы верш „Беразіна". Сябры журы звярнулі ўвагу таксама на тэксты Анелі Скаўронскай („Венера") з Беластока і верш у прозе „Ліст" сёлета адзінай аўтаркі-студэнткі (ветэрынарыі!) Мартыны Леанеўскай з Варшавы („пераканаўчы, нешматслоўны" — як адзначыў Я. Трацяк). У прозе вылучаны былі дэбютантка беластачанка Ніна Бручко-Анджэюк („Андрэіха") родам з Плёсак за апавяданне „Сенакос", гайнавянка Ірэна Лукша („Каліна") родам з Семяноўкі ды Анатоль Маўчун („?") з Познані за эсэ „Мы і прырода". Разам аўтараў было шаснаццаць — яшчэ з Бялок Нарваўскай гміны — Мікалай Лук'янюк („Ярош"), з Нарвы — Ірэна Юрчук („Іра"), з Мікушына на Познаньшчыне — Віталь Воранаў („КРАП"), з Пасек Нараўчанскай гміны — Аліна Леанеўская („Пчолка"), з Гайнаўкі — Кацярына Грыгарук („Анна Дзям'ян"), з Беластока — Зінаіда Кандрацюк („Праўда"). Аўтары на завяршэнні конкурсу пазнаёмілі сяброў са сваімі творамі, атрымалі ўзнагароды і падарункі (багатыя наборы беларускіх кніг і дыскаў). Выступілі — з новай кнігай „Адплываем з Мора" Віктар Швед ды прафесар Ян Чыквін, старшыня Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", рэдактар літаратурна-мастацка-крытычнага часопіса „Тэрмапілы". Паэт-прафесар успомніў таксама і пра лёс былых удзельнікаў „Дэбюту", якія неўзабаве выдалі свае кнігі ў бібліятэчцы „Белавежы", стаўшы яе членамі — як Юрка Буйнюк і Юстына Каролька (Грыцюк), дэбютавалі на старонках элітарных „Тэрмапілаў" — як Лідзія Маліноўская, Кацярына Сянкевіч (у 2011 г. і яны будуць мець свае дэбютанцкія зборнікі). Пайшоў далей м.інш. і Віталь Воранаў. Заданнем конкурсу „Дэбюту" з'яўляецца вылаўліванне талентаў, штуршок у іх росце, як адзначыў галоўны рэдактар „Нівы" Яўген Вапа. Урачыста-сямейная сустрэча ўсіх удзельнікаў конкурсу, якую арганізуе „Ніва" заўсёды на завяршэнне „Дэбюту", з'яўляецца добрай нагодай для знаёмства пачаткоўцаў з літаратарамі і літаратурай і адных з аднымі. Усе беларускія дарогі вядуць у „Ніву". Тут могуць друкаваць яны свае выказванні на тэму роднага — свойскага кругагляду, спраў, дзяліцца парывамі душы.

Дэбютанткі Вікторыя Патонец і Ніна Бручко-Анджэюк

Віктар Швед падпісвае свой новы зборнік „Адплываем з Мора"; (справа стаяць) Ірэна Лукша, Ірэна Юрчук, Зінаіда Кандрацюк, Вікторыя Патонец

Багдан Дудко і прафесар Ян Чыквін

ISSN 0546-1960